

У ГОМЕЛІ АДКРЫЛАСЯ БЕЛАРУСКАЕ «СКОЛКАВА» 5

ЯК ІМУННЫЯ ПАШПАРТЫ СТАНОВЯЦЦА ЦВЁРДАЙ ВАЛЮТАЙ 7




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

16 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 115 (29229)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ХМЕЛЬ, міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Мы дакладна разумеем задачы, якія трэба ў галіне вырашаць, і нарада з удзелам кіраўніка дзяржавы ў Полацку вельмі дапамагла аддаць увагу прыярытэтным пытанням. Сёння я выразна падзяляю два такія паняцці, як выніковасць і эфектыўнасць работы. Калі выніковасць ацэньвае насельніцтва, то пра добрую выніковасць казаць яшчэ рана, і гэта асноўны пасыл кіраўніка дзяржавы і асноўная задача ў маёй рабоце. Трэба аддаць больш увагі рабоце з насельніцтвам. Не насельніцтва павінна звяртацца да нас са скаргамі, а мы павінны дайсці да яго і даведацца, што яго турбуе, і вырашыць праблемы па меры магчымасці».*

# РАМОНКАВЫ ЎРАДЖАЙ



Фота БелТА.

**У КСУП «Саўгас Вялікае Мажэйкава», што ў Шчучынскім раёне, які спецыялізуецца на вырошчванні лекавых траў, цяпер час збору ўраджаю рамонкаў. Бела-жоўтымі гаючымі кветкамі ў гаспадарцы занята каля 300 гектараў. Косяць іх адмысловыя камбайны, а кіроўца Аляксандр САФОНАЎ *(на фота)* адвозіць рамонкавы ўраджай на далейшую перапрацоўку.**

## КОРАТКА

● Кансультацыі па падрыхтоўцы да ЦТ у беларускіх школах будуць праходзіць да 23 чэрвеня.

● **Паўночны актыў «Беларуснафты» плануе ўдвая павялічыць здабычу газу і газакандэнсату ў 2020 годзе.**



● Больш за 500 прапаноў работы чакаюць саіскальнікаў Мінска на электронным кірмашы вакансій 18 чэрвеня.

● **У Беларусі амаль 44 тысячы доўгажыхароў ва ўзросце 90—99 гадоў.**

● Пераможцамі конкурсу «Найлепшы экспарцёр 2019 года» сталі 22 прадпрыемствы.

● **Мінскае «Дынама» падало дакументы для ўдзелу ў наступным сезоне КХЛ.**

Будзьце пільныя

# ШТО ПАД РУКУ ТРАПІЦЬ...

### Зламыснікі не грэбуюць нават хатнімі нарыхтоўкамі

**Нядаўна патэлефанавала сяброўка дзяцінства.**

**— Я ў роспачы, — пачала Галіна без прадмовы. — Восенню пасадзіла на лецішчы сем маладых туй. Адно дрэўца абышлося амаль у 60 рублёў. А калі прыехала вясной на дачу, то жахнулася — усе саджанцы выкапаныя. Праўда, я здагадваюся, хто мог гэта зрабіць, але, як кажуць, не злоўлены — не злодзей.**

Непадалёку ад дачнага кааператыва, дзе займела ўчастак жанчына, жыве Іван — яе стрыечны брат. Некалькі гадоў адседзеў за кратамі, пасля вызвалення нідзе не працаваў, жыў на пенсію маці. Летась старая памерла. Вялікаўзроставага лайдака падкормлівалі вяскоўцы, ды і Галіна час ад часу прывозіла яму ежу. Але ж да закускі патрэбна яшчэ і выпіўка, а купіць няма за што. Вось і рызыкнуў абкрасці блізкую сваячку. Калі моцна прыціснуў мужчыну, як кажуць, да плота муж сяброўкі, ён прызнаўся... Ды што з таго: не будзеш заяўляць у міліцыю на злодзея, якніяк — радня.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

lider-press.by

СТАР. 6

Прафесійная адукацыя

# Кліентаарыентаванасць і псіхалагічнае тэсціраванне

### Чаму вучаць спецыялістаў сферы ЖКГ?

**У любой сферы дзейнасці самае галоўнае — гэта людзі, і таму вельмі важна ўдзяляць дастаткова ўвагі адукацыі і падрыхтоўцы кадраў. Асабліва ў такой сферы, як жыллёва-камунальная гаспадарка, якая мусіць пастаянна развівацца. І мала хто ведае, што ў Беларусі існуе нават асобны вучэбны цэнтр, спецыялісты якога пастаянна ўдасканальваюць працэс навучання камунальнікаў. Чаму так важна гэта рабіць, расказвае дырэктар ДВЦ «Жылкам» Кацярына ГАРБАЧОВА.**

***— Кацярына Васілеўна, чаму спецыялістам сферы ЖКГ трэба пашыраць свае веды і як вы ім у гэтым дапамагаеце?***

— Сфера пастаянна развіваецца — гэта датычыцца і развіцця тэхналогій, якія там выкарыстоўваюць, і нарматыўнай прававой базы, таму вельмі важна, каб камунальнікі не адставалі ад гэтага працэсу. І прынцыповым крокам не толькі ў развіцці жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў цэлым, але і ў адукацыі спецыялістаў сферы стала дырэктыва № 7, якую Прэзідэнт падпісаў у сакавіку мінулага года. Згодна з дакументам, арганізацыі ЖКГ павінны забяспечваць свае кадры навучаннем і праверкай ведаў, дакладней — навучаннем і праўдзеннем абавязковай атэстацыі. Канешне, дырэктыва як нарматыўны прававы акт мае праграмны характар, але для часткі даручэнняў устаноўлены пэўныя тэрміны. Напрыклад, праз наш цэнтр ці іншыя вучэбныя цэнтры ЖКГ кожны год прафесійную падрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі ці перападрыхтоўку павінны праходзіць не меней за 20 % супрацоўнікаў кожнай арганізацыі ЖКГ.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

У цэнтры ўвагі

# АБРАНЫ ШЛЯХ — ПРАВІЛЬНЫ

## Развіццё эпідсітуацыі ў краіне абмеркавалі ў Савеце Рэспублікі

**Спікер верхняй палаты парламента Наталля КАЧАНАВА на нарадзе з вядучымі медыкамі Беларусі — прадстаўнікамі міністэрства аховы здароўя, вучонымі-інфекцыяністамі, кіраўнікамі медустаноў — абмяняліся меркаваннямі аб эпідэміялагічнай сітуацыі, якая сёння складваецца ў краіне.**


Фота БелТА.

Старшыня Савета Рэспублікі прапанавала ўдзельнікам нарады агучыць сваё бачанне цяперашняга эпідстановішча ў краіне і яго перспектыў. Яна паведаміла, што падчас сустрэч з працоўнымі калектывамі людзі мала пытаюцца аб каранавірусе, але цікавяцца, ці будзе другая хваля захворвання, чаго чакаць суайчыннікам. «Мы павінны абмяняцца меркаваннямі, каб разумець, як нам рухацца далей, прымаць нейкія рашэнні», — адзначыла спікер. Яна не выключае, што працэс вяртання бальніц у звычайны рэжым (г. зн. да перапрафілявання іх для аказання дапамогі пацыентам з COVID-19) можна працягваць.

Наталля Качанава падкрэсліла: і навукоўцы, і практыкі пацвярджаюць правільнасць абранай у Беларусі стратэгіі ва ўмовах пандэміі. «Ва ўсім свеце прызналі, што наша краіна пайшла абсалютна правільным шляхам. Мы не ўводзілі каранцінныя меры і сёння бачым, што працуе эканоміка», — адзначыла яна.

**Міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК** падкрэсліў, што сітуацыя з COVID-19 у нашай краіне застаецца кантралюемай. Па яго словах, перапрафілявангага ложкавага фонду дастаткова. Што датычыцца рэгіёнаў, ужо ідзе гаворка аб вяртанні да папярэдняга рэжыму работы. «Але ў любым выпадку, каб зрабіць гэты працэс сапраўды навукова абгрунтаваным, трэба мець дастаткова аб'ектыўны прагноз захваральнасці, каб разумець, як паэтапна будзем выходзіць з гэтага», — адзначыў міністр і канстатаваў: хвароба новая, таму адпрацаваных мадэляў прагназавання сёння не існуе. «Мы выкарыстоўваем мадэлі, зыходзячы з вопыту тых рэгіёнаў, якія першыя ўвайшлі ў эпідэміялагічны працэс». Ацэнка вопыту Віцебска паказала, што эпідсітуацыя развіваецца па адным сцэнарыі. Адсюль быў прыняты прагноз для сталіцы і астатніх рэгіёнаў.

Падчас нарады таксама абмяркоўвалася арганізацыя платнага экспрэс-тэсціравання на COVID-19. У цэнтры ўвагі была работа ўсёй сістэмы аховы здароўя, пачынаючы з паліклінічнага звяна і да санаторыяў, дзе пацыенты праходзяць рэабілітацыю.

**Паводле БелТА.**

# АРЭНДА ДЛЯ МЕДРАБОТНІКАЎ І ПЕДАГОГАЎ

**Саўмін Беларусі пашырыў пералік грамадзян, якія маюць першачарговае права на атрыманне арэнднага жылля.**

Як паведамляе прэс-служба ўрада, першачарговае права на прадастаўленне арэнднага жылля камунальнага жыллёвага фонду атрымалі грамадзяне з ліку трэнераў-выкладчыкаў па спорце спецыялізаваных вучэбна-спартыўных устаноў, сярэдніх школ — вучылішчаў алімпійскага рэзерву; трэнераў нацыянальных каманд Беларусі па відах спорту; медыцынскіх, педагагічных, творчых работнікаў, работнікаў культуры, якія заключылі кантракт тэрмінам на пяць гадоў, у выпадку пацвярджання патрэбнасці ў спецыялісце; медыцынскіх і педагагічных работнікаў устаноў сацыяльнага абслугоўвання, якія ажыццяўляюць стацыянарнае сацыяльнае абслугоўванне, арганізацый аховы здароўя, якія аказваюць паліятыўную медыцынскую дапамогу ў стацыянарных умовах.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Блізкая ўлада

# ВОДАЗАБЕСПЯЧЭННЕ, ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ І ПРАВЯДЗЕННЕ КАПІТАЛЬНЫХ РАМОНТАЎ...

**Больш як тры дзясяткі зваротаў ад жыхароў Гомельскай вобласці паступіла на прамую тэлефонную лінію старшыні аблвыканкама Генадзя САЛАЎЯ. Праблемныя пытанні, на якія звярнулі ўвагу абаненты, цяпер на кантролі губернатара.**


Фота БелТА.

Чатыры звароты датычыліся водазабеспячэння. Жыхарка аграгарадка Камунар Буда-Кашалёўскага раёна паскардзілася, што пэўны час у населеным пункце не працавала помпа, не было вады. Праблему, здаецца, вырашылі, але з крана пайшла вада з пяском. Паскорыць ачыстку калодзежаў прасіла пенсіянерка з вёскі Рудзянец гэтага ж раёна. Пытанне водазабеспячэння ўзнялі таксама вяскоўцы з Брагіншчыны.

Звярнуліся на прамую лінію і жыхары Гомельскага раёна.

Свой зварот пакінула шматдзетная сям'я, якая пражывае ў аграгарадку Урыцкае. Яны атрымалі кватэру ў пасёлку Бальшавік, але не маюць сродкаў ні на рамонт, ні на куплю неабходнай мэблі.

Жыхарка аграгарадка Чырвонае паскардзілася, што сусед незаконна адабраў у яе 1,5 метра ўчастка, цяпер ёй складана карыстацца асабістым транспартам, вароты дрэнна адчыняюцца.

Генадзь Салавей даручыў старшыні райвыканкама разгледзець і вырашыць усе пытанні, якія ўзнялі жыхары раёна.

З вёскі Вуглы, што на Брагіншчыне, гаспадыня паскардзілася на мясцовых жанчын, якія перагарадзілі праход па вуліцы і не даюць выганяць кароў да пашы. У вёсцы іх усяго на падворках засталося дзесяць. Паша ў канцы адной з вуліц. Цяпер вадзіць жывёлу даводзіцца ў абход.

— Асабіста ў нас чатыры каровы. Быў сход па гэтым пытанні, але ж мы ў меншасці, — звярнула ўвагу на прамой лініі жанчына. Губернатар падкрэсліў: зварот без увагі не застанецца.

Жыхарка Камарына пацікавілася, як маладой сям'і вырашыць кватэрнае пытанне. У новым доме жылплошчу атрымалі грамадзяне, чыё жыллё раней было прызнана аварыйным. Яе ж сям'я цяпер 87-я ў чарзе на будаўніцтва. Генадзь Салавей адзначыў, што дэталёва разбярэцца ў сітуацыі, якая склалася.

Некалькі зваротаў да губернатара ад жыхароў Гомеля датычыліся стану дарог і правядзення будаўнічых работ у абласным цэнтры.

Гамяльчанін, які пражывае па вуліцы Пакроўскай, расказаў, што пасля забудовы 104-га мікрараёна іх прыватны сектар ператварыўся ў «аўтамагістраль»:

— Наша вуліца стала транзітнай, але няма ні тратуараў, ні разметкі.

На яго думку, вырашыць праблему можна арганізацыяй аднабаковага праезду па некаторых вуліцах і ўстаноўкай святлафора. Губернатар даў даручэнне кіраўніцтву Гомельскага гарвыканкама разгледзець варыянты карэкціроўкі транспартнага руху.

Яшчэ адну гамяльчанку турбавала будоўля дома на скрыжаванні праспекта Кастрычніка і Студэнцкага праезда. Перагароджаны праезд праз двор да трох дамоў, няма схемы часовага руху. Да таго ж, будоўля ідзе кругла сутачна, а шум перашкаджае спакою жыхароў навакольных дамоў. Губернатар узяў гэтае пытанне на асабісты кантроль.

Пасля прамой лініі **старшыня камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама Дзмітрый ГАЙКЕВІЧ** растлумачыў, што з 11 чэрвеня будаўнікі перайшлі з трохзменнага на двухзменны рэжым работы. Часовую схему аб'езду пададуць ва ўсе экстранныя службы: хуткую дапамогу, міліцыю, МНС і іншыя. Акрамя таго, пасля завяршэння будаўніцтва дома дваровая тэрыторыя будзе добраўпарадкавана — высадзяць дрэвы і абсталююць дзіцячую пляцоўку.

На недахопы правядзення капітальнага рамонту дома па вуліцы Тэльмана паскардзіўся жыхар Гомеля. Па яго словах, капрамонт пачалі ў лютым:

— Больш як тыдзень мянялі трубы ў санвузлах, больш трох тыдняў дом быў без гарачай вады. Многа падрадчыкаў, пастаянныя нестыкоўкі. Некалькі гадоў таму за ўласныя грошы жыхары пафарбавалі пад'езд. Падчас рамонту будаўнікі сапсавалі пафарбаваныя сцены, аднаўляць не збіраюцца. Пашкоджаны ўваходныя дзверы ў пад'езд і тамбур, — пералічыў прычыны свайго незадавальнення гамяльчанін.

Пытанне якасці капітальнага рамонту дома агучылі таксама жыхары шматпавярховіка па вуліцы Маісеенкі.

Жыхар Акцябрскага раёна патэлефанаваў, каб вырашыць праблему з атрыманнем участка для будаўніцтва дома, вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі. Казаў, што з выдзяленнем зямлі на вёсцы ў яго ўзніклі складанасці.

— Чалавек хоча будавацца на вёсцы, і пытанне трэба вырашыць, — паставіў задачу перад кіраўніком раёна старшыня аблвыканкама.

Увогуле ў дачыненні да кожнага са зваротаў Генадзь Салавей адзначыў, што ў аблвыканкаме агучаныя жыхарамі рэгіёна пытанні і праблемы дэталёва разгледзяць і прапануюць канкрэтнае іх вырашэнне.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

На слыху

# Персанал будзе працаваць вахтавым метадам

## Шэраг мер бяспекі прыняты ў аздараўленчых лагерах

**У цяперашняй эпідэміялагічнай сітуацыі для бяспечнага адпачынку дзяцей у аздараўленчых лагерах дзейнічаюць беспрэцэдэнтныя патрабаванні. Распрацаваны і пералік рэкамендацый для санаторыяў, дзе адпачываюць дарослыя. Пра гэта ў эфіры тэлеканала АНТ расказала галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Беларусі Наталля ЖУКАВА.**

Паводле яе слоў, прагнозы на чэрвень аб павольным зніжэнні захваральнасці на каранавірусную інфекцыю спраўджваюцца. Ёсць тэрыторыі, дзе колькасць выпадкаў мінімальная, на іншых эпідпрацэс яшчэ працягваецца, але ў цэлым назіраецца станоўчая дынаміка.

Сур'ёзная работа праведзена для падрыхтоўкі школьных і аздараўленчых лагераў. У прыватнасці, персанал аздараўленчых устаноў будзе працаваць вахтавым метадам.

— Прыняты шэраг беспрэцэдэнтных мер. Сёння гэта неабходна, каб адпачынак быў сапраўды аздараўленчы. І гэта задача не толькі медыкаў, але і ўласнікаў лагераў. Цяпер персанал будзе выязджаць за пяць дзён да адкрыцця лагера. Мы павінны ўпэўніцца, што ўсе, хто будзе працаваць, здаровыя. І вахтавы метад будзе доўжыцца ўсю змену, — расказала Наталля Жукава.

Яна адзначыла, што будуць абмежаваны і скарэктаваны некаторыя агульналагерныя мерапрыемствы. У прыватнасці, дзяжурства дзяцей у харчблоку і збор усіх атрадаў разам. Сур'ёзная ўвага аддадзена санэпідрэжыму: гэта прыборкі, дэзынфекцыя, стан здароўя персаналу. Вялікая нагрузка ляжа на медыкаў аздараўленчых лагераў. Плануецца штодзённа апытваць дзяцей, пры неабходнасці вымяраць тэмпературу. А вось бацькам наведваць дзяцей не рэкамендуецца. У выпадку, калі бацькі забяруць дзіця, вярнуць яго, каб працягнуць змену, будзе складана.

Наталля Жукава падкрэсліла, што ў беларускіх здраўніцах таксама прымаюцца ўсе меры перасцярогі, бяспекі і санэпідрэжыму. Калі іх выконваць, адпачынак будзе максімальна бяспечны.

Па звестках на 15 чэрвеня, у Беларусі зарэгістравана 54 680 выпадкаў COVID-19. Паправіліся і выпісаны 30 420 пацыентаў, у якіх раней была пацверджана каранавірусная інфекцыя, 312 чалавек памерлі. За перыяд распаўсюджвання інфекцыі праведзена 749 917 тэстаў. За апошнія суткі прырост склаў 707 інфіцыраваных, выпісана 317 пацыентаў, памерлі чацвёра.

**Алена КРАВЕЦ.**

Аты-баты

# КЛЯТВА НА ВЕРНАСЦЬ

**Цырымонія прыняцця прысягі, якая адбылася ў мінулую суботу ў воінскіх часцях Беларусі, гэтым разам была незвычайная. Калі раней у тыя ж самыя Печы два разы на год прыязджалі запоўненыя «пад завязку» электрацягнікі, а на аўтадарозе ледзь не ўтвараліся заторы, то мінулая суботняя раніца была зусім на тое не падобная.**

Праз эпідэміялагічную сітуацыю камандаванне Узброеных Сіл прыняло рашэнне не запрашаць родных і блізкіх навабранцаў на прыняцце прысягі. Замест гэтага на Youtube-канале «Ваен ТБ» была наладжана прамая трансляцыя з 72-га гвардзейскага аб'яднанага вучэбнага цэнтра падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў, размешчанага ў Барысаве, і 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння, якая дыслакуецца ў Мар'інай Горцы. У сацыяльных сетках і месенджарах іншылі пафакзы з іншых часцей краіны. Агулам клятву на вернасць Радзіме прамовілі каля 3,4 тысячы прызваных на тэрміновую ваенную службу і службу ў рэзерве.

Між іншым, месяц таму адпраўка вайскоўцаў у часці таксама праходзіла без публічных урачыстых мерапрыемстваў. Пра гэта нагадаў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН:**

— Здароўе ў вайсковых калектывах было, ёсць і застаецца вельмі важным. Напрыканцы месяца ў 72-м аб'яднаным вучэбным цэнтры плануецца адкрыць медыцынскае падраздзяленне. Яно будзе абсталявана па ўсіх сучасных патрабаваннях.

— Умацоўваць абароназдольнасць краіны — гэта няпросты абавязак, які пад сілу толькі сапраўдным мужчынам, — звярнуўся да салдат Віктар Хрэнін. — І спярша вам будзе няпроста, паколькі цяплічных умоў у арміі няма. Але калі пройдзеце ўсе выпрабаванні, то не толькі станеце сапраўднымі абаронцамі Айчыны, але і будзеце згадваць армію як важны жыццёвы досвед.



Фота БелТА.

Ваеннае ведамства пры гэтым адзначае, што ў краіне робяцца захады для павышэння матывацыі тых, хто прызываецца ў войска. Напрыклад, з гэтага года тэрмін службы залічваецца ў страхавы стаж, неабходны для налічэння пенсіі. У студэнтаў, якія маюць рэкамендацыі з часцей, з'яўляецца першачарговае права на месца ў інтэрнаце, а таксама на выбар працоўнага месца пры размеркаванні. На падрыхтоўчых курсах вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў яны могуць вучыцца за кошт бюджэту. Абітурыенты, якія маюць такія рэкамендацыі, могуць паступаць у ССНУ без конкурсу на найбольш запатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. У ліку прэферэнцый — залічэнне без іспытаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы на спецыяльнасці профілю «Ахова здароўя». Але пры гэтым за плячыма трэба мець сярэднюю спецыяльную медыцынскую адукацыю.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Надвор'е

# ЗНОЎ СПЯКОТА, АЛЕ ДАЖДЖЫ...

**У пятніцу да нас завітае марское паветра і калі ласка — 32 цяпла**

**Ужо традыцыйна ў пачатку лета нас як бы правярае на вытрымку трапічнае надвор'е. На гэтым тыдні яно чакаецца гарачае і з вялікай порцыяй ападкаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Гэтымі днямі ў шматкіламетровай тоўшчы атмасферы зноў усталююцца паўднёва-ўсходнія плыні. Паветраныя масы зноў пачнуць паступаць да нас з поўдня Еўрапейскай Расіі і з Усходняй акваторыі Чорнага мора, дзе назапасілася вельмі цёплае і вільготнае паветра. Так што сезон дажджоў у нас, мяркуючы па ўсім, працягнецца. За мінулую палову чэрвеня вільгаці ўжо выпала дастаткова, а па паўночна-ўсходняй частцы краіны ў асобных рэгіёнах ужо і залішне.

Заўтра ўдзень чакаецца пераменная воблачнасць. Месцамі, пераважна па паўднёвым захадзе краіны, будуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Вецер умераны, пры навальніцах парывісты. Уначы на сераду будзе ад 14 да 20 цяпла, удзень — плюс 25—31 градус. Пераменная воблачнасць прагназуецца і ў чацвер. Уначы па паўднёвым захадзе, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. У асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Вецер чакаецца паўднёва-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 15 да плюс 20 градусаў, удзень — плюс 25—31 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу чакаецца пераменная воблачнасць, з праясненнямі. У разгар дня спякота будзе яшчэ мацнейшая. Уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі. Вецер будзе ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература ўначы складзе ад плюс 15 да плюс 20 градусаў, удзень — плюс 26—32 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Будзьце ў курсе

# Тэрмін скончаны, але дакумент сапраўдны

## Пратэрмінаваныя пашпарты, даведкі, дапамогі можна не мяняць тры месяцы

**Дакументы, тэрмін дзеяння якіх скончыўся або завяршаецца сёлета ў перыяд з 30 красавіка па 31 ліпеня, будуць сапраўднымі яшчэ тры месяцы. Пры гэтым аўтаматычнае працягненне часу дзеяння афіцыйных папер не забараняе грамадзянам, якія хочуць памяняць дакумент, зрабіць гэта. Такія магчымасці, а таксама пералік дакументаў, якія можна не мяняць, вызначаны пастановай Саўміна № 299.**

Сярод дакументаў і рашэнняў, якія не абавязкова прадаўжаць адразу пасля завяршэння тэрміну іх дзеяння, наступныя:

даведка аб знаходжанні на ўліку асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў;

даведка аб займаемым жылым памяшканні і складзе сям'і;

даведка аб месцы жыхарства і складзе сям'і;

копія асабовага рахунку;

рашэнне аб назначэнні дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў;

заключэнне ўрачэбна-консультацыйнай камісіі (УКК), медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі (МРЭК);

даведка аб стане здароўя;

дазвольная дакументацыя на будаўніцтва аднакватэрнага, блакіраванага жылога дома;

пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;

пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь;

дакументы аб запрашэнні іншаземных грамадзян і асоб без грамадзянства;

дазвол на права займацца працоўнай дзейнасцю ў Рэспубліцы Беларусь іншаземнаму грамадзяніну;

пасведчанне кіроўцы;

дакумент аб дзяржрэгістрацыі транспартнага сродку;

дазвол на набыццё грамадзянскай зброі;

допуск да здачы практычнага экзамену на права кіравання механічным транспартным сродкам.

Падоўжаны таксама тэрмін дзеяння асобных дакументаў у сферы аховы аб'ектаў прамысловай уласнасці, заключэння дзяржаўнай экспертызы па горадабудаўнічым, архітэктурным праекце, дазволу на размяшчэнне сродкаў вонкавай рэкламы, набыццё і захоўванне зброі, сертыфікаты прадукцыі (тавары, паслугі), шэраг іншай дазвольнай дакументацыі, у тым ліку на ўвоз і вываз пэўных тавараў.

Пасля завяршэння трохмесячнай адтэрміноўкі заяўнікі абавязаны звярнуцца да адпаведнага ўпаўнаважанага органа за выдачай новых дакументаў загадзя ў адпаведнасці з вызначаным законам парадкам.

**Ірына СІДАРОК.**

А не шкодзь!

# ЗДЫМАЛІ СЕТКІ Ў РАЗГАР НАВАЛЬНІЦЫ,

**але браканьерам не дапамог нават праліўны дождж**

**У краіне скончыўся нерастава перыяд. Хто толькі не трапляўся «на кручок» інспектарам гэтай вясной! Як паведамляе Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце, гэта былі і нелегалы з электравудамі, і аматары вугра, і самая шматлікая катэгорыя — браканьеры з сеткамі. Двое з іх, ледзь дачакаўшыся заканчэння забароны на лоўлю ў Віцебскай вобласці, на наступны ж дзень выйшлі на промысел.**

Рыбакі-нелегалы разлічвалі, што фінансавыя прэтэнзіі да іх у выпадку затрымання не будуць вельмі высокімі. Аднак яны налавілі столькі рыбы, што іх незаконны набытак пацягнуў на круглую суму.

Парушальнікі ўстанавілі тры велізарныя сеткі даўжынёй амаль 400 метраў на возеры Сельцы ў Глыбоцкім раёне. Здымалі забароненыя прылады ў разгар навальніцы пад праліўным дажджом. Але такая маскіроўка не дапамагла — на беразе іх чакалі інспектары. 57 кілаграмаў рыбы (у асноўным ліня і ляшча) абыдуцца браканьерам як мінімум у 9 тысяч рублёў.

Яшчэ дваіх браканьераў затрымалі на Прыпяці ў Пінскім раёне. Яны таксама ўстанавілі нямала сетак — восем штук даўжынёй 700 метраў, вылавіўшы пры гэтым 18 кілаграмаў рыбы. «Не пашанцавала» і тром магілёўцам, якія паспелі павезці незаконны ўлоў з вадаёма, але былі затрыманыя пры праверцы службай ДАІ. У іх машыне знайшлі дзве сеткі і амаль 15 кілаграмаў рознай рыбы. Урон прыродзе склаў 4,7 і 3 тысячы рублёў адпаведна, а гэта нагода для працягнення да крымінальнай адказнасці.

Нягледзячы на тое, што самы напружаны перыяд скончыўся, работа інспектараў на вадаёмах працягваецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Ядзерныя дзяржавы працягваюць мадэрнізацыю сваіх арсеналаў



Такая высnова ўтрымліваецца ў чарговым дакладзе аб становішчы ў сферы ўзбраенняў, апублікаваным Стакгольмскім міжнародным інстытутам даследавання праблем міру (SIPRI). Як сцвярджаюць эксперты, «на пачатак 2020 года дзевяць ядзерных дзяржаў — ЗША, Расія, Вялікабрытанія, Францыя, Кітай, Індыя, Пакістан, Ізраіль і Паўночная Карэя — мелі сукупна 13,4 тысячы адзінак ядзернай зброі». «Каля 3,72 тыс. адзінак захоўваюцца на складах аператыўных часцей, каля 1,8 тыс. з іх знаходзяцца ў стане аператыўнай гатоўнасці», — адзначаецца ў дакуменце. У 2018 годзе агульнае скарачэнне ў свеце ядзерных узбраенняў адбылося ў асноўным у выніку дэмантажу Расіяй і ЗША (на дзве краіны прыпадае звыш 90 % сусветных запасаў ядзернай зброі) састарэлых боегаловак у адпаведнасці з дагаворам аб скарачэнні і абмежаванні стратэгічных наступальных узбраенняў, заключаным у 2010 годзе. Летась арсеналы абедзвюх краін заставаліся ў вызначаных дагаворам межах. Калі ён не будзе падоўжаны, яго дзеянне спыніцца ў лютым 2021 года. Перамовы аб падаўжэнні старога або заключэнні новага дагавора летась вынікаў не прынеслі, адзначаюць эксперты SIPRI.

## Усе мікрараёны Пекіна праз COVID-19 перавялі ў «рэжым ваеннага часу»



У кітайскай сталіцы ад панядзелка ўведзены «рэжым ваеннага часу» ва ўсіх жылых мікрараёнах горада з-за ўспышкі каранавіруса. Пра гэта паведаміла інфармагенцтва ТАСС са спасылкай на мясцовыя ўлады. Адзначаецца, што адпаведны рэжым горада закрануў 7120 жылых мікрараёнаў Пекіна. У спецмерапрыемствах задзейнічана больш за 100 тысяч чалавек. На мінулым тыдні ўспышка каранавіруса была выяўлена на найбуйнейшым пекінскім аптовым рынку «Сіньфадзі» ў раёне Фэнтай, што на поўдні горада. Большасць тых, хто заразіўся, — работнікі гандлёвых кропак, а таксама асобы, якія знаходзіліся з імі ў цесным кантакце. Адміністрацыя горада была вымушаная часова закрыць некалькі іншых важных камерцыйных аб'ектаў, у тым ліку на захадзе сталіцы, паколькі яны апынуліся ў зоне павышанай рызыкі. У сувязі з гэтым у асобных раёнах Пекіна ўведзеныя ўзмоцненыя меры кантролю. Таксама рэжым ваеннага становішча быў уведзены ў 11-мільённым Баадзіне — горадзе на паўднёвым захадзе ад Пекіна, які мяжуе з кітайскай сталіцай.

## Запасы золата ў Нью-Ёрку дасягнулі рэкорду

Запасы золата ў сховішчах нью-ёркскай біржы Comex дасягнулі рэкорднага аб'ёму — 29,7 мільёна тройскіх унцый, паведамляе The Wall Street Journal са спасылкай на кампанію FactSet, якая сабрала дадзеныя з 2013 года. Амаль тры чвэрці гэтага золата, якія важаць як дзевяць цалкам загружаных самалётаў Boeing 737-700, прыбылі ў Нью-Ёрк толькі ў апошнія тры месяцы, падкрэслівае газета. «Залатую ліхаманку» ў Нью-Ёрку выдание звязвае з пандэміяй, якая справакавала хаос на рынку каштоўных металаў з-за парушэння ланцужкоў паставак.

# Кліентаарыентаванасць і псіхалагічнае тэсціраванне




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Выходзіць, што ў асноўным ваш цэнтр і займаецца падрыхтоўкай, перападрыхтоўкай і павышэннем кваліфікацыі кадраў?***

— І датычыцца гэта як рабочых, так і спецыялістаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў. А сёлета з красавіка, згодна з пастановай Саўміна, у нас з'явілася новая задача: мы будзем праводзіць атэстацыю асоб, што прэтэндуюць на пасаду служачых арганізацый, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю жыллёвага фонду ці аказваюць жыллёва-камунальныя паслугі.

***— Сёння ў вашым цэнтры рэалізуецца каля 120 навучальных праграм. Чаму вучацца спецыялісты?***

— Слухачы праходзяць тэарэтычнае і практычнае навучанне — менавіта для гэтага ў нас створаны спецыяльныя класы. Напрыклад, яны вучацца абслугоўваць сасуды пад ціскам, абслугоўваць жыллёвы фонд у сучасных умовах ці іх вучаць быць больш кліентаарыентаванымі. Напрыклад, тыя ж хаус-майстры, якія будуць займацца комплексным абслугоўваннем будынкаў, адразу вывучаюць тэорыю і трэніруюцца на нашых трэнажорах па водазабеспячэнні і ацяпленні і толькі потым ідуць на практыку ў арганізацыі ЖКГ. Выбудаваны такім чынам навучальны працэс дазваляе мінімізаваць рызыку сапсавання дзеючага дарагога абсталявання і пры гэтым дазваляе дэталёва вывучыць усе нюансы, якія звязаны з гэтай прафесіяй.

***— Але ж для якаснай адукацыі трэба пастаянна ўдасканальваць сам працэс навучання?***

— Менавіта таму мы і ўкаранілі ўнікальную праграму 3D-візуалізацыі жылога дома і цеплавога пункта, якая дазваляе не толькі праводзіць навучанне, але і аказвае практычную дапамогу пры абслугоўванні будынкаў. Пандэмія каранавіруса таксама дазволіла па-іншаму паглядзець на адукацыйны працэс, і мы ўкаранілі дыстанцыйнае навучанне спецыялістаў. Напрыклад, для вызначэння дзелавых і асобасных якасцяў мы распрацавалі праграму псіхалагічнага тэсціравання, таксама ёсць магчымасць праходжання рэпетыцыйнага тэсціравання, і ўсё гэта можна рабіць аддалена і кругласутачна. Акрамя таго, усе кансультацыі з выкладчыкамі мы праводзім анлайн, і ехаць у Мінск зусім не абавязкова. Усе гэтыя тэхнічныя рашэнні дазваляюць прадпрыемствам значна зніжаць затраты на навучанне супрацоўнікаў.

***— Аднак не толькі ж пандэмія паўплывала на выбудоўванне больш сучаснага падыходу да навучання?***

— Мы пастаянна распрацоўваем электронныя падручнікі, праводзім вэбінары, а не так даўно нават стварылі спецыяльны клас па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі. З дапамогай дапоўненай рэальнасці мы дэманструем спецыялістам, як працуе гэтая сістэма ў Беларусі. Для планшэтаў створана спецыяльная праграма, і пры яе можна ўбачыць інфармацыйны ролік, прысвечаны тэме адходаў, прагуляцца па розных раздзелах, убачыць працэс перапрацоўкі адходаў і што можна з іх атрымаць. Таксама на стэндзе ў класе можна знайсці ўзоры пелет і гранул. А ў дадатак да гэтага распрацаваны і настольныя дапаможнікі — кнігі з QR-кодам, які чытае тая ж самая праграма. На нашым сайце можна знайсці ўсю неабходную інфармацыю пра навучанне, мы распрацавалі сэрвіс для зручнай аплаты праз QR-код, а ўсе планы і графікі кіраўнікі прадпрыемстваў атрымліваюць з візіткамі з QR-кодам, інфармацыя на якіх аднаўляецца кожны тыдзень. Слухачам трэба толькі захацець скарыстаць усё гэта.

***— І вельмі ж важна, каб і выкладчыкі не адставалі...***

— Не так даўно з калегамі з Германіі мы падпісалі пагадненне, згодна з якім, нашы выкладчыкі будуць мець магчымасць вывучыць не толькі новыя метады навучання, але і новыя тэхналогіі. Яны будуць наведваць прадпрыемствы ў рамках дысцыплін, якія выкладаюць слухачам. Таксама разам з нямецкімі калегамі мы дамовіліся рэалізоўваць праект па падрыхтоўцы кадравых рэсурсаў для галіны абыходжання з адходамі і па ўкараненні сучасных тэхналогій першаснай апрацоўкі і выкарыстання другаснай сыравіны ў Беларусі. Галоўнай яго мэтай выступае вырашэнне праблем у гэтай сферы. Мы плануем нават набраць групу спецыялістаў-выкладчыкаў, якія пройдуць навучанне па кірунках, прапісаных у нашым пагадненні, па якіх у будучым стануць навучаць спецыялістаў сферы ЖКГ.

***— А ці могуць спецыялісты выпадкова двойчы трапіць на навучанне да вас?***

— Менавіта для гэтага мы стварылі праграмны комплекс «Статыстыка», які пастаянна аднаўляецца. Тут сабраны звесткі пра тых, хто ўжо прайшоў атэстацыю, пра тое, якія сертыфікаты былі выдадзены, калі людзям спатрэбіцца зноў праходзіць атэстацыю. Цяпер мы распрацоўваем новыя падыходы да фарміравання банка даных і плануем весці ўлік усіх тых асоб, якія нават проста праходзілі навучанне ў нашым цэнтры.

***— Што ж датычыцца атэстацыі — нядаўна прынцыпова змяніліся падыходы. Сёння яе абавязаны праходзіць усе, хто прэтэндуе на кіруючую пасаду ў сферы ЖКГ?***

— І калі яны не пройдуць атэстацыю, то проста не змогуць займаць пасаду. Усяго адзначана шэсць галін, па якіх прэтэндэнт будзе здаваць экзамен. Па якой з іх канкрэтна, ужо будзе залежаць ад сферы дзейнасці прадпрыемства. Пры гэтым хтосьці можа здаваць экзамен адразу па ўсіх, а хтосьці — толькі па адной. Калі спецыяліст вырашыць змяніць месца работы, але сфера дзейнасці застанецца тая ж, то зноў праходзіць атэстацыю яму не трэба. Калі ж, напрыклад, галоўны інжынер ЖЭУ пажадае перайсці на такую ж пасаду, але ў арганізацыю, якая ўжо займаецца вывазам цвёрдых камунальных адходаў, то экзамен ён павінен будзе здаць зноў, але ўжо па іншых кірунках.

***— І якім чынам праходзіць экзамен?***

— У форме камп'ютарнага тэсціравання. Звычайна адна галіна атэстацыі ўключае 60 пытанняў, адна палова з якіх адносіцца да прафесійнай падрыхтоўкі, а другая — да тэарэтычных ведаў асноў эканомікі, бухгалтарскага ўліку, аховы працы, заканадаўства аб барацьбе з карупцыяй, працы, адміністрацыйных працэдур, зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, жыллёвага заканадаўства. Калі ж чалавек будзе здаваць экзамен адразу па некалькіх галінах, то на гэтыя 30 тэарэтычных пытанняў ён адказа толькі адзін раз, і ў кожнай галіне будзе ўжо толькі 30 пытанняў, якія будуць адносіцца менавіта да прафесійнай падрыхтоўкі. На падрыхтоўку адказу слухачу даецца адна хвіліна, і лічыцца, што ён паспяхова здаў экзамен, толькі ў тым выпадку, калі адказаў не меней чым на 85 % пытанняў. Калі экзамен быў не здадзены, то прэтэндэнту трэба нанава прайсці адміністрацыйную працэдуру і здаць экзамен.

***— Атэстацыю абавязаны прайсці нават асобы, якія прэтэндуюць на пасаду старшыні праўлення. А што датычыцца іх навучання ў цэлым?***

— Наш цэнтр — першы, які ўкараніў праграму навучання для іх, але, на мой погляд, 56 гадзін для навучання вельмі мала, тут патрабуецца больш прафесійная падрыхтоўка. Дом — складаная інжынерная канструкцыя, і кіраваць ім павінны прафесіяналы. Магчыма, з цягам часу мы павялічым колькасць гадзін.

***— Гэта значыць, што перш за ўсё для прафесійнага кіравання маёмасцю патрэбны прафесіянал?***

— Для паспяховага развіцця любой сферы патрэбны высокакваліфікаваныя кадры, і забяспечыць якасную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў сферы ЖКГ дазваляюць вучэбныя цэнтры. Аднак ім самім трэба пастаянна працаваць над стварэннем і аднаўленнем сучаснай вучэбна-матэрыяльнай базы, распрацоўкай вучэбна-праграмнай дакументацыі і адказна падыходзіць да выбару выкладчыкаў. І самае галоўнае — любы спецыяліст ці кіраўнік прадпрыемства павінен разумець, што ад яго ведаў, навыкаў і ўменняў залежыць не толькі эфектыўная работа прадпрыемства, але і ў цэлым работа сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

**Валерыя КІСЛАЯ.**

Стыхія

## НАВАЛЬНІЧНЫ ФРОНТ НАРАБІЎ БЯДЫ

**Паводле аператыўных даных МНС, з-за праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (да 18 м/с) у нядзелю пацярпелі адзін населены пункт у Бярэзінскім раёне Мінскай вобласці і адзін населены пункт у Глускім раёне Магілёўскай вобласці. Пашкоджаны дахі аднаго жылога дома, аднаго вытворчага і аднаго сельскагаспадарчага будынкаў.**

У Бярэзінскім раёне зафіксаваны 45 выпадкаў падзенняў дрэў на лініі электраперадачы. Без электразабеспячэння заставаліся 33 населеныя пункты і 8 сельскагаспадарчых будынкаў. Для электразабеспячэння малочнатаварных фермаў былі задзейнічаны генератары МНС і іншых арганізацый. У 22.50 электразабеспячэнне спажыўцоў было адноўлена.

У Барысаве Мінскай вобласці ў выніку выпадзення ападкаў у выглядзе дажджу (з 12.00 да 19.00 выпала 31,6 мм пры сярэднямесячнай норме 85 мм) былі падтопленыя 6 падворкаў і адзін участак дарогі.

Пацярпелых няма, работа аб'ектаў жыццезабеспячэння не парушаная. Работнікамі МНС і іншых арганізацый праводзіліся работы па адпампоўванні вады, распілоўцы і ўборцы дрэў, што звaліліся. Вядуцца аднаўленчыя работы.

Па даных ДВА «Белэнерга», на працягу сутак на тэрыторыі краіны перыядычна парушалася электразабеспячэнне 279 населеных пунктаў, 42 сельскагаспадарчых будынкаў і 855 трансфарматарных падстанцый. Адключэнні аператыўна ліквідаваліся аварыйнымі брыгадамі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**«Лета ў радасць са «Звяздой»**



Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або II паўгоддзе 2020 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 ліпеня 2020 года ў рэдакцыю на адрас: вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, г. Мінск, 220013.

Сярод падпісчыкаў 17 ліпеня 2020 года будуць разыграны 7 танометраў A&D і суперпрыз — масажор ручны Bradex. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 25 ліпеня 2020 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня 2020 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або II паўгоддзе 2020 года і пашпарта. Пасля 30 верасня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Лета ў радасць са «Звяздой» чытайце ў нумары 112 газеты «Звязда» ад 11 чэрвеня 2020 года.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 15.06.2020 да 30.09.2020.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3800 ад 08.06.2020 года, выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2020 года**

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ____________________
*(аддзяленне сувязі)*
**на III квартал або II паўгоддзе 2020 года**

**Хатні адрас і тэлефон** ____________ *(абавязкова)* *(індэкс)*

____________________

____________________

Удачы ў розыгрышы!

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!
БЕЛГАЗПРОМБАНК 30 ОСНОВАН В 1990

**ОТЧЕТ**

О проведении рекламной игры «Покупка удачи 5.0».
Место и дата составления отчета: 12.06.2020г.
г. Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328.

1. Организатор: Общество с ограниченной ответственностью «ТриВижн», 220030, г.Минск, пр. Независимости, 11/2, офис 328, УНП 190624910.

2. Наименование рекламной игры – «Покупка удачи 5.0».

3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3738 от 31.01.2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

4. Срок начала рекламной игры: 17 февраля 2020 г.
Срок окончания рекламной игры: 25 июня 2020 г.

5. Количество участников рекламной игры: 8 887 участников.

6. Призовой фонд разыгран полностью.

7. Победители рекламной игры: Главный приз 10 000,00 рублей. Победитель Борисюк Игорь Игоревич, г. Высокое и 1 000 (Одна тысяча) победителей. Каждый победитель выиграл денежный приз в размере 100,00 (Сто) белорусских рублей 00 копеек. Все призы перечислены на расчетные счета Победителей до 25 июня 2020 (включительно). Список победителей находится на сайте ОАО «Белгазпромбанка», www.belgazprombank.by, в разделе «Новости».

8. Для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 17 209-90-03.

9. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было.

Директор ООО «ТриВижн» Носик Д.В.

Праекты і рашэнні

# НА ЎЗОР «СКОЛКАВА»

## Першая чарга тэхнапарка «Карал» адкрылася ў Гомелі

**Гэта ўнікальны вопыт для Беларусі па стварэнні суб'екта інавацыйнай дзейнасці пры ўдзеле свабоднай эканамічнай зоны. Поўная назва маштабнага гомельскага інвестпраекта — «Рэканструкцыя комплексу капітальных пабудоў для стварэння і развіцця навукова-тэхналагічнага парка РУСП «Агенцтва развіцця і садзейнічання інвестыцыям». Ён рэалізуецца на тэрыторыі СЭЗ «Гомель-Ратон», а ініцыятарам стварэння тэхнапарка выступіў Гомельскі аблвыканкам. За аснову ўзятая канцэпцыя расійскага інавацыйнага цэнтра «Сколкава».**

Галоўная ідэя тэхнапарка — стварэнне ўмоў для арганізацыі, развіцця і дзейнасці інавацыйных прадпрыемстваў, вытворчасці запатрабаваных на сучасным рынку тавараў і паслуг, умацаванне партнёрскіх адносін паміж органамі ўлады, навукі, бізнесу і адукацыі.

Праект прадугледжвае рэканструкцыю вытворчых памяшканняў і адміністрацыйна-бытавых карпусоў, якія ўваходзілі ў склад былога завода «Карал». Цяпер паступова змяняецца архітэктурна-планіровачнае рашэнне завадскіх будынкаў і іх функцыянальнае выкарыстанне.

Першая чарга першага пускавога модуля, так званага «Модуля В», — гэта аднаўленыя памяшканні агульнай плошчай больш як 2,3 тысячы «квадратаў». Тут прадугледжаны зоны з розным функцыяналам: офісныя, вытворча-лабараторныя і дапаможныя памяшканні. Створаны цэнтр прататыпавання і 3D-мадэлявання, які дапаможа выкарыстоўваць лічбавыя тэхналогіі не толькі ў вытворчасці, але і ў медыцыне. Цэнтральны вылічальны комплекс на базе двух высокапрадукцыйных сервераў здольны забяспечыць патрэбы не толькі самога тэхнапарка, але і іншых арганізацый Гомеля.

Падчас урачыстага адкрыцця аб'екта **старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ** адзначыў, што тэхнапарк стане важным пунктам апоры для развіцця эканомікі не толькі гэтага рэгіёна, але і краіны ў цэлым:

— Тут будуць акумулявацца распрацоўкі перспектыўных маладых навукоўцаў і інавацыйных стартапаў. У тэхнапарка ўжо ёсць пагадненні аб супрацоўніцтве з ВНУ і ўстановамі аховы здароўя, распачынаюць дзейнасць першыя рэзідэнты, — заявіў кіраўнік вобласці. — Прыцягваючы фінансавыя і інтэлектуальныя рэсурсы, тэхнапаркі з'яўляюцца драйверам эканамічнага і сацыяльнага развіцця рэгіёнаў.

Праект і асноўны аб'ём будаўніча-мантажных работ выканалі гомельскія архітэктары і будаўнікі. З улікам карэкціровак першапачатковага праекта было сэканомлена больш за 300 тысяч рублёў.

Сярод тых, хто ўжо выказаў жаданне стаць рэзідэнтам гомельскага тэхнапарка, — кампанія «Інтэкс і К». Падчас адкрыцця першага пускавога модуля яны прэзентавалі распрацоўкі па павышэнні бяспекі эксплуатацыі цягнікоў.

Гомельская абласная клінічная бальніца дагавор аб супрацоўніцтве з тэхнапаркам заключыла яшчэ ў сакавіку сёлета. Ва ўстанове створана сучасная лячэбная база, вядуцца распрацоўкі новых матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні высокатэхналагічных аперацый.

Актыўна супрацоўнічаць з тэхнапаркам плануюць таксама вышэйшыя навучальныя ўстановы рэгіёна.

Між тым у перспектыве першы модуль злучаць галерэяй з суседнім «Модулем А». Яго плошча больш за сем тысяч



Фота БелТА.

квадратных метраў. Увод у эксплуатацыю запланаваны на наступны год.

«Модуль А» — гэта шасціпавярховы будынак, які цяпер у стадыі рэканструкцыі. У ім размесцяцца каворкінг-цэнтр, канферэнц-зала, перагаворныя пакоі, офісы і фуд-корты, тэрыторыі для адпачынку і паркоўка. У перспектыве таксама плануецца стварыць дзіцячы тэхнапарк.

Кіраўнік адміністрацыі СЭЗ «Гомель-Ратон» Антаніна Яжова спадзяецца, што тэхнапарк стане своеасаблівым магнітам для прыцягнення інвестыцый у інавацыйныя праекты, якія рэалізуюцца ў тым ліку ў рамках СЭЗ, паспрыяе стварэнню новых бізнес-рашэнняў, а галоўнае — дапаможа таленавітым і амбіцыйным людзям рэалізаваць свае ідэі.

Інвестпраект па будаўніцтве тэхнапарка ўключаны ў Дзяржаўную праграму інавацыйнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады. Фінансаванне ажыццяўляецца пераважна з інавацыйнага фонду Гомельскай вобласці, а таксама з рэспубліканскага цэнтралізаванага інавацыйнага фонду і фонду развіцця СЭЗ «Гомель-Ратон». Стваральнікі тэхнапарка ўпэўнены, што маштабны бізнес-комплекс павысіць прывабнасць Гомеля для прадпрымальніцтва, а самому абласному цэнтру ў перспектыве дазволіць разгрузіць цэнтральную частку горада ад мноства офісаў і аўтатранспарту.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

---

На стылі

# НАСІЦЬ, ГЛЯДЗЕЦЬ, ЗАХАПЛЯЦЦА

## У Мінску завяршыўся міжнародны праект «ТэкСтыльны букет — 2020»



**Карціны з бабаўняных лапікаў і сумкі з ільну, вышыўка ў стылі народнага арнаменту і выкшталцонай шляхетнасці, роспіс па тканіне і плеценыя дарожкі, нібы толькі што з бабулінай вясковай хаты, габелены з усходнімі матывамі і арт-аб'екты з воўны, шматлікія вышываныя і тканыя пано, дзіўныя аўтарскія скульптуры і нават крэселка з тканіны і дрэва — усё гэта часткі міжнароднага фестывалю «ТэкСтыльны букет — 2020». У праекце, які доўжыўся два месяцы, днямі была пастаўлена прыгожая кропка ў выглядзе моднага паказу ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў.**

Фестываль «ТэкСтыльны букет», які зладзілі ў Беларусі ўжо другі раз, мусіў аб'яднаць усе кірункі тэкстыльнай дэкаратыўнай творчасці і сабраць удзельнікаў, прафесіяналаў і аматараў з шасці краін, ад Казахстана да Канады, расказвае намеснік дырэктара НЦСМ па творчай рабоце, мастацтвазнавец, куратар праекта Алеся ІНАЗЕМЦАВА. Але праз пандэмію каранавіруса і імклівае закрыццё межаў паспелі даслаць свае работы на фестываль толькі прадстаўнікі Беларусі, Расіі і Казахстана. Дый саму экспазіцыю найлепшых узораў тэкстыльнага мастацтва, ад традыцыйных тэхнік да наватарскіх эксперыментаў, ва ўмовах самаізаляцыі і абмежавання масавых культурных мерапрыемстваў давялося адкрываць і праводзіць праз анлайн-трансляцыю і віртуальны агляд у панарамным фармаце 360⁰. «Але, напэўна, гэта той выпадак, калі не было б шчасця, ды



няшчасце дапамагло, — прызнаюцца супрацоўнікі цэнтра сучасных мастацтваў. — Дзякуючы выхаду на інтэрнэт-платформы наш праект убачылі і даведаліся пра Беларусь людзі з розных краін свету — зацікаўленыя каментары мы атрымлівалі, напрыклад, з Турцыі і Кіпра. Таму, спадзяёмся, налета геаграфія фестывалю яшчэ пашырыцца».

Упершыню пасля распаду СССР прадставілі ў Беларусі свае габелены майстры з Казахстанскай акадэміі мастацтваў, а прадстаўнікі Расіі паказалі вялізную калекцыю шытва са шматкоўй. Беларусы ж найбольш парадавалі наватарствам і эксперыментамі з тэкстурай, формай і матэрыяламі (з улікам таго, што пад тэкстылем апошнім часам разумеюць любое перапляценне, нават калі гаворка пра сталёвыя ніці, прастора для творчасці амаль неабсяжная). Упрыгожаннем экспазіцыі сталі творы беларускага квілт-клуба «Валошкі» — гэта творчая суполка каля 10 гадоў аб'ядноўвае жанчын розных узростаў і прафесій, для якіх тэкстыльнае мастацтва з'яўляецца ўлюбёнай справай. Менавіта «Валошкі», дарэчы, выступілі ініцыятарамі і арганізатарамі тэкстыльнага фестывалю ў Мінску і нават прыдумалі яго назву. Сёлета ж яны прадставілі як асобныя работы, так і калектыўны праект па матывах



слуцкіх паясоў, для якога майстрыхі вывучалі гістарычныя хронікі і партрэты беларускай шляхты.

Але на заключным Fashion Show дэманстраваліся ўсё ж не тэкстыльныя навацыі і не фантазіі на гістарычную тэму, а цалкам адпаведныя часу і месцу работы айчынных дызайнераў. А паказвалі, як усё гэта можна насіць, мадэлі сталічнай школы прыгажосці Rozarium, кіраўнік якой Ірына Садоўская робіць акцэнт на мадэлях залатога ўзросту і plus-size. Зрэшты, гледзячы на шэрагі абаяльных жанчын, хацелася цікавіцца не іх узростам ці памерам адзення, а тым, дзе выдаюць такія прыгожыя ўсмешкі, — нават не скажаш, што для некаторых удзельніц дэфіле стала першым у жыцці.

Маладая дызайнер Анжаліка Плескачэўская зрабіла надзвычай актуальную калекцыю... масак. З нададакучлівай неабходнасці яны ператварыліся ў стыльны аксесуар: некаторыя ўражвалі ручной вышыўкай, а некаторыя лёгкім рухам рукі трансфармаваліся ў сімпатычныя кашнэ. «Вельмі прыгожа! Дайце дзве!» — не вытрымаў нехта з публікі. Таксама знайшліся ахвотныя прымераць і летні гардэроб паводле гістарычных матываў Сярэдняй Азіі ад Рэнаты Сцяпанавай, і пяшчотныя кветкавыя сукенкі ад Аксінні Смірновай... І хоць невялікі ў сілу колькасці прысутных, але самы сапраўдны фурор выклікала калекцыя з воўны ад Галіны Знак. «Гэта мая любоў, якую я нясу ў масы паўсюдна, дзе толькі можна, у тым ліку праз адкрытыя майстар-класы на YouTube, бо воўна — універсальны матэрыял, з якога можна зрабіць усё што пажадаеце. Воўна — не толькі валёнкі і шапкі, але і летнія паліто, і кардыганы, і вячэрнія сукенкі», — прызналася дызайнер, дэманструючы ўласнаручную валеную абноўку — эфектную накідную спадніцу-сетку з роспісам.

— Нягледзячы ні на што, «ТэкСтыльны букет» атрымаўся сапраўдным святам дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, своеасаблівым арт-рэлаксам, якога многім з нас у цяперашніх умовах асабліва не хапае, — падводзіць вынікі праекта арт-куратар Алеся Іназемцава. І з ёй цяжка не пагадзіцца, калі на свае вочы бачыш, што культурнае жыццё ў сталіцы і не толькі працягваецца, бо крэатыў, фантазію, творчасць немагчыма паставіць на паўзу.



**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

# ШТО ПАД РУКУ ТРАПІЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Але не толькі дачнікаў абкрадаюць. Пад покрывам ночы наведваюцца аматары чужой маёмасці і ў невялікія населеныя пункты, дзе жывуць у асноўным пажылыя. У маёй роднай вёсцы памерла кабета, а дом завяшчала сваёй пляменніцы, якая зрэдку наведвалася на малую радзіму. Дык вось, за зіму з хаты зладзеі вынеслі ўсе падушкі, коўдры, посуд. І нават разабралі на бярвенні хляўчук, дзе захоўвалася розная непатрэбшчына. Вылічыць, хто гэта зрабіў, не склала ніякай цяжкасці. Калі што прапала з дома, агарода, то адназначна падазрэнне падала на Воўку. Сядзіць на шыі ў бацькоў, працаваць не хоча, а кульнуць чарку любіць. Пашыбавала да лайдака і мая зямлячка, маўляў, прызнавайся, а то ўчастковага выклічу. І тут залямантавала маці, не трэба міліцыі, мы табе за ўсё сплацім.

А нядаўна супрацоўнікі крымінальнага вышуку Барысаўскага раённага ўпраўлення ўнутраных спраў затрымалі двух братоў, падазраваных у серыі крадзяжоў з прыватных уладанняў. Дзесяць разоў яны хадзілі на справу. У перыяд з лютага да красавіка 2020 года мужчыны, якія раней траплялі ў поле зроку праваахоўных органаў, зрывалі з дзвярэй дачных дамоў і гаспадарчых пабудоў замкі, выстаўлялі шыбіны ў вокнах і траплялі ўнутр. Адтуль яны выносілі прадукты харчавання, адзенне, пасцельную бялізну, бытавую тэхніку.

Сапраўды, на лецішчах, у вёсках зламыснікі крадуць усё, што трапляе пад руку: розны хатні і садовы інструмент, маладыя дрэўцы, кусты, хатнія нарыхтоўкі, бытавыя прыборы і нават здзіраюць электраправодку. Кантынгент такіх «чысцільшчыкаў» вядомы: асацыяльныя элементы, што злоўжываюць спіртным, якія, як правіла, не маюць работы і сродкаў да існавання.

Найбольш часта крадзяжы на дачах здзяйсняюцца са снежня да красавіка: гаспадары адсутнічаюць на сваіх садовых участках. Менавіта да такіх высноў прыйшла пракуратура Мінскай вобласці пасля аналізу работы суб'ектаў прафілактыкі па папярэджанні крадзяжоў маёмасці з дачных кааператываў.

— За чатыры месяцы гэтага года ў домаўладаннях садовых таварыстваў Міншчыны здзейснены 141 крадзеж, гэта на 22,5 % менш, чым за адпаведны перыяд мінулага года, — адзначае **першы намеснік пракурора Мінскай вобласці Барыс ПЯТРОЎСКІ.**

Напрыклад, у Валожынскім раёне такіх выпадкаў зарэгістравана тры супраць сямі летась. І гэта пры тым, што тут налічваецца 85 садовых масіваў. На змяншэнне колькасці крадзяжоў паўплываў комплекс мер. Гэта і работа праваахоўных органаў, і ўкараненне тэхнічных сродкаў аховы, і асцярожнасць саміх уладальнікаў маёмасці. Марыя Іванаўна, дачніца са стажам, пажартавала, што гэтаму пасадзейнічала пандэмія каранавіруса, калі патэнцыяльныя зладзеі сядзяць дома. Аднак жанчына трымае на дачы аўчарку. Пасля заканчэння сезона ездзіць карміць вернага вартаўніка праз дзень і восенню, і зімой. Сабака — найлепшы сродак аховы, лічыць яна.

Некаторыя грамадзяне спрабуюць бараніць сваю ўласнасць рознымі шумавымі, светлавымі сродкамі. Але, як правіла, зламыснікі хутка разумеюць, што гэта простая эфектная пустышка. На думку спецыялістаў, вельмі дзейсна, калі восенню дачнікі складаюць спіс дзяжурных і па чарзе «народнай дружынай» патрулююць тэрыторыю кругласутачна.

Разам з тым матэрыялы крымінальных спраў сведчаць пра тое, што адной з умоў крадзяжоў з прыватных домаўладанняў з'яўляецца асабістая бяспечнасць саміх гаспадароў. Як адзначыў Барыс Пятроўскі, на тэрыторыі дачных кааператываў цэнтральнага рэгіёна, дзе ёсць вартавая ахова і ўведзена сістэма відэаназірання ў выглядзе фотапастак, здзейснена 14 крадзяжоў — усяго 10 % ад колькасці такіх злачынстваў. Практычна адсутнічаюць крадзяжы з дамоў, якія знаходзяцца на абслугоўванні Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў.

Аналагічныя меры аховы раіць пракуратура і сельскагаспадарчым арганізацыям Міншчыны, дзе са снежня да красавіка 2020 года выяўлена 37 крадзяжоў, што менш чым за леташні перыяд на 48,7 %. Напрыклад, у Нясвіжскім раёне два механізатары працавалі на энерганасычаных трактарах. Тэхніку ведалі дасканала і, нягледзячы на ўстаноўленыя датчыкі GPS, скралі больш як 200 літраў дызельнага паліва кожны.

Усяго ж на аб'ектах аграпрамысловага комплексу Мінскай вобласці, якія забяспечаны вартавой аховай, здзейснена 17 крадзяжоў. Там, дзе функцыянуе сістэма відэаназірання, зафіксавана дзевяць выпадкаў. У тым ліку тры факты раскрыты з дапамогай фотапастак.

Па выніках маніторынгу пракурор Мінскай вобласці Сяргей Хмарук накіраваў у Мінаблвыканкам інфармацыйную запіску з канкрэтнымі прапановамі па папярэджанні крадзяжоў. У прыватнасці, разглядзець пытанне аб эксперыменце з дапамогай абсталявання сістэмамі відэаназірання тэрыторый: перыметру, пад'язных шляхоў, праселкавых дарог некалькіх садовых таварыстваў, дзе найбольш часта здзяйсняюцца крадзяжы маёмасці. А камітэту па сельскай гаспадарцы і харчаванні разам з падначаленымі тэрытарыяльнымі структурамі і органамі ўнутраных спраў рэкамендавана правесці маніторынг па тэхнічным умацаванні вытворчых аб'ектаў. Па выніках абследавання прапанаваць кіраўнікам суб'ектаў гаспадарання забяспечыць службы аховы відэакамерамі, фотапасткамі ў большай колькасці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ❍ У тэму

### Некалькі парад дачнікам:

• Калі вы злавілі злодзея на сваёй дачы, не займайцеся самасудам. Ён можа падаць сустрэчны іск, і вы акажацеся на лаўцы падсудных. Пастарайцеся яго затрымаць і выклічце міліцыю.

• Пастаўце надзейныя запоры на варотах, высокую агароджу. Любы бар'ер на шляху зламыснікаў можа захаваць вашу маёмасць.

• Калі пасля сезона ад'язджаеце ў горад, забярыце з сабой усё каштоўнае.

• Найміце добрага вартаўніка за ўмераную плату. Арганізуйце з членаў дачнага кааператыва брыгаду «хуткага рэагавання», якая будзе ахоўваць вуліцы ў вячэрні час ад няпрошаных гасцей.

## Крымінал, здарэнні

### Ад чаго загінула рыба на Нёмане?

**Супрацоўнікам Гродзенскай абласной інспекцыі стала вядома аб тым, што на рацэ Нёман заўважана загінулая рыба, першапачаткова — у невялікай колькасці. Для ўстанаўлення прычын здарэння быў арганізаваны выезд на месца спецыялістаў усіх зацікаўленых ведамстваў.**

Дзяржінспектары разам з прадстаўнікамі Гродзенскай гарадской і раённай інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, райвыканкама, а таксама галоўны ветурач раёна пачалі абследаванне ўчастка ракі, дзе былі зафіксаваны мор рыбы.

Як паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі, да гэтага часу работы працягваюцца. Інспектары абследуюць берагі Нёмана ад Скідзеля да Гродна. Пакуль патэнцыяльных крыніц забруджвання не выяўлена, прыкмет залпавага скіду неачышчаных сцёкаў таксама. Лабараторыяй аналітычнага кантролю ўзяты пробы вады, утрыманне кіслароду па даных экспрэс-тэстаў было паніжанае. Асобіны загінулай рыбы перададзены для далейшага даследавання ў Гродзенскую абласную ветэрынарную лабараторыю.

Загінулая рыба будзе сабрана і ўтылізавана, пройдзе дэзынфекцыя. Гэтым займаюцца мясцовыя органы ўлады ў супрацоўніцтве з ветэрынарнай службай, МНС і Беларускім таварыствам паляўнічых і рыбаловаў.

### «Нарыхтаваў» больш за 37 тон металалому

**Супрацоўнікамі аддзялення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі аддзела ўнутраных спраў Пухавіцкага райвыканкама ў канцы мая была атрымана аператыўная інфармацыя, што 52-гадовы жыхар пасёлка Праўдзінскі займаецца нарыхтоўкай лому чорнага і каляровых металаў.**

Паводле інфармацыі аператыўнікаў, мужчына за сімвалічную плату скупляў яго ў тых мясцовых жыхароў навакольных вёсак, хто



Фота з сайта УУС Мінскага аблвыканкама.

злоўжывае алкаголем, пры гэтым не пытаючыся пра паходжанне здадзенага.

На днях аператыўнікі АБЭЗ Пухавіцкага РАУС сумесна з супрацоўнікамі падатковай інспекцыі па Мінскай вобласці наведаліся па ўжо знаёмым адрасе. Падчас агляду падворка вяскоўца было знойдзена і канфіскавана больш за 34 420 кілаграмаў лому чорных металаў і больш за 2 900 кілаграмаў лому алюмінія, нарыхтаванага без наяўнасці спецыяльнага дазволу і ліцэнзіі на працягу 2019—2020 гадоў, паведамляе УУС Мінскага аблвыканкама.

Канфіскаваны лом металаў перададзены на адказнае захоўванне ў ААТ «Белколермет» і ААТ «Белдругасчармет».

### Узламаў больш за 150 тысяч акаўнтаў

**Супрацоўнікамі аддзела па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій УУС Брэсцкага аблвыканкама затрыманы 23-гадовы гараджанін, які мае дачыненне да ўзлому больш як 150 тысяч акаўнтаў грамадзян розных краін.**

З кастрычніка 2018 да лютага 2020 года для атрымання несанкцыянаванага доступу да старонак карыстальнікаў у сацыяльных сетках ён выкарыстаў шкоднаснае праграмнае забеспячэнне, якое валодае функцыяй падбору лагіна і пароля.

Як паведамляе УУС аблвыканкама, за названы перыяд незаконным спосабам малады чалавек змог прайсці амаль 152 тысячы паспяховых аўтарызацый. На шэрагу рэсурсаў падазраваны знаходзіў уліковыя запісы з наяўнымі на рахунку грашыма і пераводзіў іх сабе, адкрываючы доступ да асабістага кабінета. У выпадку, калі сродкаў не аказвалася, жыхар абласнога цэнтра выкарыстоўваў чужы акаўнт і займаўся накруткай лайкаў і галасоў, пасля чаго спрабаваў прадаць даражэй.

Спосабам крымінальнага заробку хлопец у лістападзе мінулага года падзяліўся з таварышам і адправіў яму файл шкоднай праграмы. Апошні, ведаючы аб незаконнасці дзеянняў, спрабаваў выкарыстаць яе на адной з вядомых гульнявых платформаў.

### Атрымліваў пенсію па пашпарце памерлага цесця

**У Мазыры мясцовая міліцыя выявіла злачынную схему ў сферы сацзабеспячэння. Па праверачных матэрыялах аператыўнікаў АБЭЗ следчыя распачалі крымінальную справу па факце махлярства ў асабліва буйным памеры. Падазраваным прызнаны 67-гадовы ўкраінец, які на працягу чатырох гадоў атрымліваў пенсію па пашпарце памерлага цесця.**

Як паведамляе МУС, гісторыя пачалася ў 2009 годзе, калі пажылы мазыранін з'ехаў жыць да дачкі ў Чарнігаў. Мужчына не папярэдзіў аб пераездзе мясцовы сабес і не змяніў рэгістрацыю, таму пенсія працягвала паступаць на банкаўскую картку. Тэрмін дзеяння пластыку скончыўся ў 2012 годзе, і налічэнні прыпыніліся. Да таго часу беларус скканаў і быў пахаваны ва Украіне.

У 2013 годзе зяць нябожчыка з карысці вырашыў скарыстацца яго беларускім пашпартам. Праз знаёмага з Мазыра ён выйшаў на спецыяліста гарадскога ўпраўлення па працы, занятасці і сацабароне.

Для чыноўніцы падазраваны выдумаў легенду: маўляў, цесць знаходзіцца ў Чарнігаве, цяжка хварэе, таму не можа самастойна прыехаць і падаць заяву на аднаўленне пенсійных выплат. Мужчына пераканаў спецыяліста зрабіць гэта на падставе яго пісьмовага звароту і папрасіў вызначыць месцам выдачы наяўных мясцовае аддзяленне пошты.

Падманутымі аказаліся і работнікі пошты, якім украінец выдаў сябе за нябожчыка, падаўшы яго пашпарт. Нягледзячы на розніцу ў дзесяць гадоў мужчыны былі падобныя, таму падазраванаму пачалі выдаваць грошы.

З 2013 да 2017 года іншаземец выкраў такім чынам звыш 18 тысяч рублёў. Сума магла стацца большай, але аферыст на некалькі месяцаў прыпыніў свае візіты ў Беларусь, што стала падставай для паўторнага прыпынення выплат. Яшчэ раз наведаць сабес украінец не наважыўся.

Зараз следчыя ўстанаўліваюць ролю кожнага ўдзельніка злачынства. У прыватнасці, дзеянні спецыяліста гарадскога ўпраўлення па працы, занятасці і сацабароне правяраюцца на прадмет службовай халатнасці.

### Зламаны будзільнік і пржавелы мангал...

**Віцебскія праваахоўнікі затрымалі серыйнага дачнага злодзея. Ён не грэбаваў выкрадаць нават рэчы, якія адслужылі сваё, паведамляе падрабязнасці аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС аблвыканкама.**

Пасля выхаду з месцаў зняволення ў снежні мінулага года 35-гадовы жыхар Ушацкага раёна вярнуўся да злачыннага промыслу. У поле яго зроку патрапілі дачныя дамы. Мужчына залазіў у чужое жыллё і выносіў адтуль усё, што можна. Прагнасць і ўсёеднасць зламысніка ўразіла нават вопытных аператыўнікаў. Так, падчас здзяйснення чарговага эпізоду ён умудрыўся выкрасці нават зламаны будзільнік і пржавелы мангал.

Пасля першых здзейсненых крадзяжоў мужчына набыў патрыманую іншамарку, пасля чаго значна пашырыў геаграфію сваіх «прыгод». У спісах крадзяжоў значацца Віцебскі, Полацкі, Шумілінскі, Докшыцкі і Ушацкі раёны. Таксама нястомны зладзюжка паспеў засвяціцца і на Міншчыне. Усяго на рахунку падазраванага мінімум 15 абакрадзеных лецішчаў. Зрэшты, як мяркуюць праваахоўнікі, эпізодаў можа быць нашмат больш.

Канец прыгодам зламысніка паклалі супрацоўнікі крымінальнага вышуку. Яны здолелі высачыць падазраванага і затрымаць яго. Уразіў праваахоўнікаў іператрус у доме мужчыны. Сваё жыллё ён літаральна запоўніў выкрадзенымі рэчамі. У дачыненні да мужчыны распачата крымінальная справа.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ІМУННЫЯ ПАШПАРТЫ: «ЗА» І «СУПРАЦЬ»

## Як антыцелы да COVID-19 становяцца цвёрдай эканамічнай валютай

**У XIX стагоддзі ў амерыканскім штаце Луізіяна жоўтая ліхаманка, смяротнасць ад якой дасягала 50 працэнтаў, падзяліла ўсіх людзей на два «гатункі» — на тых, хто «акліматызаваўся», перахварэў, і тых, у каго імунітэту да яе не было. Адсутнасць апошняга вызначала, ці можа чалавек браць шлюб і з кім, дзе ён можа працаваць, а ў некаторых выпадках нават станавілася падставай, каб трапіць у рабства. Фактычна ў грамадстве была створана «эпідэміялагічная іерархія».**

**У XXI стагоддзі паўтарэнне падобнага сцэнарыя і дыскрымінацыя ў залежнасці ад наяўнасці і адсутнасці імунітэту зноў сталі цалкам верагоднымі. Адразу ў многіх краінах свету пасля наступлення пандэміі каранавіруса пачалі гучаць галасы на карысць увядзення імунных covid-пашпартоў. Іх плюсы і мінусы абмяркоўваюцца ў ЗША, Чылі, Заходняй Еўропе, выклікаючы бурныя дыскусіі. Нямецкі ўрад папрасіў заняцца вывучэннем гэтага пытання Савет па этыцы, задача якога кансультаваць вышэйшыя органы ўлады па складаных маральна-этычных праблемах.**

### «СЕРТЫФІКАТЫ ЗДАРОЎЯ»

Міністр аховы здароўя Германіі Енс Шпан лічыць, што такі дакумент у першую чаргу пойдзе на карысць усім тым, хто ва ўмовах пандэміі каранавіруса па ўласнай ініцыятыве хацеў бы ведаць, ці ёсць у яго імунітэт. Ён праводзіць аналогію з запісамі аб прышчэпках ад адру або гепатыту, бо сем з васьмі жыхароў Германіі маюць на руках так званы пашпарт прышчэпак (Impfpass), дзе фіксуюцца ўсе праведзеныя вакцынацыі. Як яго выкарыстоўваць, вырашае сам пацыент, нагадвае міністр.

«У мяне ёсць даведка!» — будуць казаць людзі, якія перахварэлі на каранавірус, і прад'яўляць дакумент пад назвай «пашпарт імунітэту». І ўсім адразу стане ясна, што гэты чалавек незаразны для іншых і сам не рызыкуе заразіцца вірусам SARS-CoV-2. Ва ўсякім разе, так уяўляюць сабе будучыню аўтары гэтай ідэі.

А тым часам у Швейцарыі, краіне, якая стаіць на варце права на недатыкальнасць прыватнага жыцця і вядомая якасцю сваіх сродкаў абароны інфармацыі, стварэнне імунных пашпартоў ідзе зараз поўным ходам. Менавіта тут размешчаны шматлікія кампаніі, якія працуюць з блокчэйн-тэхналогіямі, здольнымі стварыць насамрэч бяспечны лічбавы банк даных па асобах, якія ўжо перахварэлі на каранавірусную інфекцыю.

Распрацоўшчыкі тлумачаць, што сертыфікаты могуць быць ануляваны ў любы момант, у тым ліку і ў аддаленым рэжыме. Таксама можна вызначаць тэрмін іх дзеяння. За імі можа ажыццяўляцца цэнтралізаваны кантроль пры гарантаванні поўнай бяспекі і прыватнасці даных уладальніка сертыфіката. Напрыклад, імунны сертыфікат можа быць ануляваны, калі партыя дыягнастычных камплектаў была прызнана ненадзейнай, што, зразумела, адмяняе і вынікі тэста.

### НЕ РЫТАРЫЧНАЕ ПЫТАННЕ

Рэспубліканскі цэнтр біяэтыкі таксама ініцыяваў анлайн-дыскусію, каб знайсці аргументы і контраргументы на карысць увядзення covid-пашпартоў. Склад яе ўдзельнікаў атрымаўся невялікі, але міждысцыплінарны — урачы, юрыст, журналіст, філосаф і біяэтыкі...

— Нядаўна мне сустрэлася цікавае меркаванне, якое кардынальным чынам адрозніваецца ад галасоў супраць. Што менавіта імунныя пашпарты і з'яўляюцца перашкодай для дыскрымінацыі, бо зараз мы дыскрымінуем тых людзей, якія маюць імунітэт: яны павінны сядзець на каранціне, захоўваць сацыяльную дыстанцыю, прытрымлівацца іншых абмежаванняў, — разважае **кіраўнік Рэспубліканскага цэнтра біяэтыкі, дацэнт кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя БелМАПА Валерыя САКОЛЬЧЫК.** — І яшчэ мне вельмі спадабалася параўнанне з лобстарамі. Лобстары не ведаюць, што іх гатуюць, асабліва калі іх пакласці ў халодную ваду і паволі падаграваць. Калі і нас будуць так пакрысе рыхтаваць да ўвядзення пашпартоў, то мы, хутчэй за ўсё, і не заўважым, як іх увядуць, і нас паставяць проста перад фактам.

— Паколькі ідэя стварэння імунных пашпартоў была агучана адначасова ў розных краінах, у тым ліку і ў нашай, можна меркаваць, што нам збіраюцца прапанаваць нейкі ўніверсальны спосаб супрацьстаяць распаўсюджванню каранавіруса, — падзялілася сваім бачаннем сітуацыі **старшы выкладчык кафедры грамадзянскага права БДУ Алена БАСАЛАЙ.** — Але любую праблему, якая закранае інтарэсы чалавека, трэба разглядаць з пункту погляду балансу грамадскіх інтарэсаў: дзеля чаго наступаюць на нашы правы і якога выніку чакаюць? Як бы банальна ні гучала, але правы і свабоды чалавека былі аб'яўлены ААН у XX стагоддзі найвышэйшай каштоўнасцю. Таму любы замах на іх павінен быць чымсьці апраўданы. Мы павінны заплаціць нейкую цану, але дзеля чаго? Гэта не рытарычнае пытанне. Калі заходзім у краму, дзе ўстаноўлены сістэмы відэаназірання, мы пагаджаемся з тым, што нас здымаюць, разумеем, дзеля чаго гэта робіцца, і пагаджаемся на тое, што атрыманыя звесткі могуць быць выкарыстаны ў тым ліку і супраць нас.

Згодна з нашым законам аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі, персанальнымі данымі лічыцца любая інфармацыя, якая дазваляе ідэнтыфікаваць чалавека (фізічную асобу). Звесткі, якія будуць утрымлівацца ў імунных пашпартах, адназначна трапляюць пад паняцце «персанальныя даныя». А ў Беларусі збор і апрацоўка персанальных даных можа ажыццяўляцца толькі са згоды носьбіта гэтай інфармацыі, гэта значыць, са згоды кожнага грамадзяніна, у адносінах да якога гэты пашпарт будзе складацца.

Але давайце разбяромся, а што трэба разумець пад грамадскай выгадай? Можа быць, гэта класічны міф, з дапамогай якога пэўныя групы будуць дасягаць сваіх мэт? І чаму мы думаем, што імунны пашпарт будзе ўключаць толькі звесткі пра «ковід»? Туды можа ўключацца значна больш інфармацыі. Хто ў такім разе будзе вызначаць яе аб'ёмы? Што ўключаць правамерна ці неправамерна?

Калі гэта адзіны спосаб супрацьстаяння каранавірусу і спыненню масавых захворванняў, гэта можа быць мэтай і апраўданнем. Але нельга забывацца і пра рызыкі. Ёсць пытанні па абароне такой інфармацыі, да таго ж у нас няма зараз гарантый, што яна не будзе выкарыстана супраць нас.

**«Дзяленне людзей па нейкім крытэрыі — стане здароўя, імунітэце, нацыянальнасці, месцы жыхарства — называецца дыскрымінацыяй».**

Наколькі я ведаю, спецыялісты называлі лічбу ў 60 працэнтаў — толькі пры гэтым паказчыку можна будзе казаць пра фарміраванне калектыўнага імунітэту. Але нават Сусветная арганізацыя аховы здароўя сумняваецца, што паўторнае інфіцыраванне COVID-19 немагчымае. Значыць, імунны пашпарт і абмежаванне правоў чалавека будуць неапраўданыя?

Рызыкну выказаць думку, што ўкараненне імунных пашпартоў будзе мець сваю рэгіянальную спецыфіку, якая будзе залежаць у тым ліку і ад заможнасці той ці іншай краіны і тэхналогій, якія яна можа сабе дазволіць. Лічу, што пра роўнасць магчымасцяў казаць тут не выпадае.

### АБАВЯЗКОВАЯ ЎМОВА — НАДЗЕЙНАЯ АБАРОНА

Дарэчы, выказваюцца думкі, што пагалоўнае тэсціраванне немагчымае нават у развітых краінах. Напрыклад, у Германіі пражывае каля 84 мільёнаў чалавек. Кожнаму патрабуюцца мінімум два сералагічныя тэсты, а гэта 168 млн тэстаў штогод (для пастаяннага маніторынгу тэсціраваць усё насельніцтва трэба хоць бы раз у год).

**❍ The Guardian**

«Калі праглядаеш аб'явы на Airbnb па Брукліне, адна з іх адразу кідаецца ў вочы. «У ГАСПАДАРА ЁСЦЬ ІМУНІТЭТ» — абвяшчае загаловак вялікімі літарамі. Сярод фатаграфій заходаў, якія можна назіраць з даху, і інтэр'ера, ёсць сёе-тое нечаканае — фатаграфія станоўчага тэста на антыцелы да каранавіруса, — піша The Guardian. — Гаспадар, Марцін Ітан, паведамляе, што ён абследаваўся праз некалькі тыдняў пасля таго, як у сакавіку перахварэў тым, што, як ён падазрае, было COVID-19. Калі вынікі абследавання на антыцелы аказаліся станоўчымі, ён вырашыў уключыць іх у свой профіль, каб паспрыяць росту колькасці браніраванняў».

«Меркаваныя перавагі імунітэту такія, што некаторыя людзі наўмысна спрабуюць заразіцца патэнцыйна смяротным вірусам», — перадае The Guardian. Як піша выданне, да медыкаў звяртаецца мноства людзей, тэст якіх на каранавірус аказаўся станоўчым пасля наведвання «каранавірусных вечарын»: яны прыйшлі туды з мэтай заразіцца, без сродкаў аховы. «Паколькі мы не ведаем дакладна, як працуе імунітэт, падобныя вечарыны — гэта дрэнная ідэя, з якога боку ні паглядзі», — папярэджваюць медыкі.




У чэрвені Германія чакае больш за 5 мільёнаў тэстаў ад швейцарскай кампаніі, але гэта колькасць дазволіць ахапіць толькі 6 працэнтаў насельніцтва. Нават Паўднёвая Карэя, якая вылучаецца высокімі паказчыкамі тэсціравання, змагла пратэсціраваць да 20 мая толькі 1,5 працэнта свайго насельніцтва.

— Магчымасць захавання медыцынскіх звестак пра чалавека на нейкіх носьбітах можа сэканоміць секунды для атрымання каштоўнай інфармацыі і аказання яму экстраннай кваліфікаванай дапамогі, — падкрэслівае **Ігар ШПІЛЕЎСКІ, урач мінскай Гарадской бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, хірург-камбустыёлаг і пластычны хірург.** — Можна паглядзець на досвед еўрапейскіх дзяржаў, дзе ўведзены ID-пашпарты. У іх закладзены і медыцынскія звесткі, і інфармацыя пра страхавыя полісы, крэдытная гісторыя ўладальніка і гэтак далей. Але ўся гэта інфармацыя надзейна абараняецца, і, скажам, доступ да звестак, што датычацца стану здароўя, мае толькі пэўная катэгорыя медыцынскіх работнікаў. Таму перш чым укараняць такія дакументы, трэба дабіцца высокага ўзроўню іх тэхнічнага забеспячэння і дакладна размежаваць, хто будзе збіраць інфармацыю, захоўваць, якая будзе абарона і хто будзе мець да яе доступ. Пакуль я для сябе адказаў на гэтыя пытанні не знайшоў. Але тое, што такі дакумент з'явіцца, зусім нядрэнна. Я ў гэтым упэўнены.

— Нам насамрэч патрабуецца такая інфармацыя, але я лічу, што яна павінна быць у вельмі вузкім доступе, бо ў адваротным выпадку мы парушым права пацыента на захаванне медыцынскай таямніцы, — падкрэслівае **Яўген КОТАЎ, урач-хірург Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі.** — Пакуль што мы вырашаем ураўненне са мноствам пераменных і не можам аб'ектыўна казаць, добра гэта ці дрэнна, дапаможа ці не дапаможа. Магчыма, пытанне ўвядзення імунных пашпартоў і не атрымае далей свайго развіцця, але падзеі могуць развівацца і іншым чынам — калі эпідэміялагічная сітуацыя будзе пагаршацца, то паўстане пытанне захавання жыцця ўжо не аднаго чалавека, а цэлых нацый. Таму не варта сёння выказвацца катэгарычна і безапеляцыйна.

### ЧЫЕ ІНТАРЭСЫ ВЫШЭЙШЫЯ?

— Дзяленне людзей па нейкім крытэрыі — стане здароўя, імунітэце, нацыянальнасці, месцы жыхарства — называецца дыскрымінацыяй, — падкрэслівае Алена Басалай. — Да таго ж правесці тэсціраванне ўсіх людзей у адзін момант не ўяўляецца магчымым, і ў нас будзе некалькі катэгорый: тыя, хто хварэюць, тыя, хто ўжо перахварэў на каранавірус, і людзі без імунітэту. Тыя, хто перахварэў, будуць адчуваць сябе пераможцамі, таму што змогуць беспраблемна перамяшчацца, выязджаць за мяжу без неабходнасці знаходзіцца там 14 дзён у каранціне, уладкоўвацца на работу, карыстацца сацыяльнай інфраструктурай і весці звычайны лад жыцця. Але ці будзе дасягнутая канчатковая мэта — спыніць распаўсюджванне каранавіруса? Нават наяўнасць антыцелаў да каранавіруса ў крыві чалавека не азначае, што ён не можа захварэць. Іншымі словамі, выдача падобных дакументаў можа стварыць у іх уладальнікаў ілюзію, быццам яны цалкам абаронены ад рызыкі паўторнага заражэння на найбліжэйшыя месяцы, гады ці нават назаўжды, хоць у навукі яшчэ няма доказаў, што гэта сапраўды так. Наадварот, наконт гэтага маецца сур'ёзныя сумненні. Вірус — зусім новы, пра яго мала што вядома. І Сусветная арганізацыя аховы здароўя пакуль не рэкамендуе ўрадам уводзіць імунныя пашпарты або сертыфікаты аб неўспрымальнасці да віруса, паколькі гэта можа наадварот паскорыць распаўсюджванне інфекцыі.

— Я сустрэла такое цікавае паняцце, як імунакапітал. Ён уплывае не толькі на сістэму аховы здароўя, але і на эканамічную сістэму. Краіны, у якіх узровень імунакапіталу вышэйшы, будуць больш паспяховыя. І, наколькі я разумею, мэта ўвядзення імуннага пашпарта — якраз высвятліць узровень імунакапіталу, — падзялілася сваімі думкамі **дацэнт кафедры судовай медыцыны БДМУ, супрацоўнік Рэспубліканскага цэнтра біяэтыкі Ганна КЛІМОВІЧ.** — Атрымліваецца, што нашы інтарэсы павінны быць падпарадкаваныя грамадскім? Асабіста я пакуль убачыла толькі адзін плюс у з'яўленні імунных пашпартоў — гэта магчымасць хутка дзейнічаць пры неабходнасці аказання экстраннай дапамогі пацыенту.

А тым часам сертыфікаты (даведкі) аб наяўнасці імунітэту ці адсутнасці факта інфіцыравання COVID, якія дазволяць пазбегнуць каранціну пры перасячэнні межаў іншых краін, паступова ўваходзяць у норму. І гэта канцэпцыя ўжо прымаецца прыватным сектарам. Так што рыхтуйцеся даказваць сваё права на свабоднае перамяшчэнне...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Духоўныя скарбы

# СТАРАДАЎНІЯ ШЫФРЫ?

**ПАДАННІ, казкі, павер'і, прыкметы, песні, замовы... Тысячагоддзямі наш народ назіраў за навакольным светам, рабіў пэўныя высновы і перадаваў назапашаныя веды. Доўгія гады даследчыкі збіралі, запісвалі, вывучалі гэтыя народныя духоўныя скарбы. «Не прыходзіцца даводзіць, наколькі патрэбна не толькі кожнаму даследчыку культурнага развіцця народаў пазнанне такіх праяў духу, як вераванні і людскія веды, але і ўсякаму грамадзяніну, хто толькі цікавіцца пазнаннем наогул і чалавекам паасобку, — пісаў яшчэ ў 1924 годзе беларускі этнограф Аляксандр Сержпутоўскі. — Хоць цяпер гэтыя людскія паняцці і розняцца ад нашых і здаецца нам недарэчнымі, але некалісь яны былі тым маленькім зярняткам, з якога вырасла вялікае дрэва сучаснай цывілізацыі і культуры». Даследчык быў упэўнены, што каб лепш зразумець сучаснае жыццё людзей, трэба азірнуцца ў глыбіню вякоў, падглядзець і падслухаць, як даўней жыў, думаў і верыў старажытны чалавек. Яшчэ не ўсё расшыфравана і растлумачана з таго, што народ назапасіў у легендах, паданнях і казках, заклаў у абрадах. Але няцяжка заўважыць, што праз народную творчасць старэйшыя людзі перадавалі нашчадкам свае каштоўнасці — вучылі жыць у згодзе з прыродай і з самім сабой, падказвалі, як весці гаспадарку, як вырасціць сумленнага, працавітага і добрага чалавека, як разабрацца са шматлікімі пытаннямі. Абрады «вырашалі» розныя практычныя задачы — дапамагалі моладзі перазнаёміцца і стварыць сям'ю, вучылі шанаваць продкаў, настройвалі людзей на станоўчыя думкі аб будучым ураджаі, дабрабыце.**

**Сучасныя даследчыкі заўважаюць, што яшчэ і сёння ў беларускіх вёсках захоўваюцца некранутыя духоўныя скарбы — у экспедыцыях яны не перастаюць адкрываць новыя дэталі, здзіўляцца народнай мудрасці, кемлівасці, фантазіі. Можа, і нашым чытачам ёсць чым падзяліцца?**

## ЧАС ЦУДАЎ,
### або Хто сядзіць у жыце?

**Адгудзеў, адзвінеў Русальны тыдзень, а ў нас у гарадах ён так і застаўся незаўважаны. Хоць у даўнія часы ў многіх беларускіх вёсках гэта свята несла людзям многа радасці і надзеі на дабрабыт і будучы ўраджай. Гэта былі дні незвычайныя, містычныя, напоўненыя казачнымі таямнічымі матывамі і вобразамі. І не выпадкова цэлы тыдзень аддадзены гэтаму святу. Прыглядзьцеся, як усё квітнее, буяе ў гэтую пару. Натуральна, нашы далёкія продкі не маглі без увагі пакінуць такія з'явы ў прыродзе.**

### Каб урадзілі палеткі...

«Даследчыкі, перагледзеўшы шматлікія запісы, прыйшлі да высновы, што якраз у вобразе русалкі беларусы ўвасобілі ідэі росту і развіцця. Русалка — гэта найперш дух раслінnасці», — заўважыла фалькларыст, этналінгвіст Таццяна Валодзіна падчас анлайн-сустрэчы, што праводзіў культурны цэнтр, які знаёміць з беларускімі абрадамі і песнямі на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках Tradycyja / Organization Tradycyja (дарэчы, сачыце за яго абвесткамі: штотыдзень тут будуць ладзіцца сустрэчы са спецыялістамі, якія вывучаюць і папулярызуюць традыцыйную культуру).

Адразу зразумела, чаму продкі ладзілі абрад з ваджэннем куста. У канцы вёскі ўся грамада налятала на апранутую ў расліны Русалку, каб адарваць сабе па галінцы і занесці на агарод. Лічылася, што тады ўсё будзе радзіць. Некаторыя гаспадыні спадзяваліся, што такі сродак дапаможа ад мядзведкі і вусеняў на капусце. Часта бабулі казалі, што провады Русалкі дапамагуць выклікаць чаканы дождж. Як бачыце, беларускія абрады часта мелі і практычную прывязку — ну хто на вёсцы не дбаў пра добры ўраджай? Менавіта таму многія з іх так доўга захоўваліся і перадаваліся праз пакаленні.

У вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна сёння русальны абрад мае статус духоўнай нематэрыяльнай каштоўнасці. Тут ён праводзіцца з вялікім размахам. Акрамя асноўнай Русалкі, у шэсці ўдзельнічаюць дзяўчаткі — Русалачкі, у канец вёскі людзі нясуць вялікую колькасць вянкоў, якія пасля будуць разрываць і заносіць на агароды.

Русальныя абрады маглі адрозніваца. У некаторых вёсках «тапталі русалку» — значыць, ладзілі вясёлыя танцы, спевы, вадзілі карагоды, скакалі цераз вогнішчы. І што цікава, у тых вёсках, дзе з шумам адзначалі Русальны тыдзень, не было гуляння на Купалле. Ды наадварот, калі вы завітаеце ў падзвінскія вёскі, дзе з размахам, багатымі спеўнымі і абрадавымі традыцыямі праходзіць Купалле, Русалку не «водзяць». Абодва гэтыя святы завязаны на пэўным коле ўяўленняў, на магіі ўрадлівасці, прычым не толькі палёў — абрады павінны спрыяць і прадаўжэнню роду чалавечага.

### Гасподнія рабочыя?

Сучасныя дзеці Русалку ўяўляюць такой, якой яе падае ў казцы Андэрсен ці прыгажунькай з дыснееўскага мультфільма. Але для Беларусі хвастатыя русалкі — рэдкасць. Нашы міфічныя прыгажуні бегаюць па палях і лясах, сядзяць у жыце, гойдаюцца на галінках дрэў, асобныя з іх нават умеюць лётаць. На жаль, сёння гэты вобраз забыты. Але ён абавязкова заслугоўвае раскруткі — у літаратуры, мастацтве, турызме. Тым больш што пра Русалку бабулі з розных куткоў Беларусі паспелі расказаць многа цікавага. Толькі ў архівах Акадэміі навук сабрана каля дзвюх тысяч запісаў, звязаных з русалкамі.

Праўда, не варта вымалёўваць нейкі адзіны вобраз гэтага міфічнага персанажа — беларускія русалкі даволі розныя, нават у суседніх вёсках апісанні маглі не супадаць. І не заўсёды гэта прыгожыя дзеўкі, недзе, па аповедах, сустракалі і пачварных істот, а ў некаторых вёсках наогул русалак уяўлялі падобнымі на птушак з вялізнымі кіпцюрамі. Таму ў Русальны тыдзень дзяўчаткам і жанчынам нельга было хадзіць з непакрытай галавой — каб русалкі не прыляцелі і не заблыталіся ў валасах ці яшчэ якой бяды не нарабілі.

Але што аднолькавае ва ўсіх беларускіх русалак — гэта доўгія валасы, часам непрыбраныя, раскіданыя па плячах, а мо і кудлатыя. Распушчаныя валасы паказваюць на пазакультурны статус русалкі, на яе дэманічную прыроду. З другога боку, выклікаюць асацыяцыі з раслінасцю. Часам бабулькі казалі, што ў русалкі валасы як трава ці як галінкі, ці гэты персанаж наогул паўстае з раслінамі замест валасоў.

У Русальны тыдзень міфічныя прыгажуні не проста калышуцца на галінках, але яшчэ і клічуць да сябе людзей. Менавіта ў гэты час можна пачуць і іх спевы.

Праўда, паводле зафіксаваных фалькларыстамі расповедаў, пачуць ды пабачыць русалак удаецца не кожнаму. У некаторых мясцовасцях верылі, што русалкі паказваюцца толькі вельмі добрым людзям.

Цікава, чаму ў некаторых вёсках русалак называлі святымі? Відаць, там людзі верылі, што русалкі робяць вельмі важную справу — сцерагуць палеткі, каб людзі не тапталі, не перашкаджалі каласкам налівацца. А тым, хто парушае правілы, духі жытнёвага палетка шкодзяць — могуць зазасытаць ці задушыць сваімі вялікімі грудзямі. Таццяна Валодзіна ўспамінае, як у адной з экспедыцый яе асабліва кранула тлумачэнне бабулькі, чаму нельга хадзіць у жыта. Старая расказвала, што русалкі на каласочках калышуць сваіх дзетак...

А ці не сведчыць той факт, што міфічных істот нават называлі «гасподнімі рабочымі», пра арганічную, далікатную знітаванасць былых архаічных уяўленняў з больш познімі хрысціянскімі. І зноў жа, які народ у свеце можа пахваліцца такім комплексам вераванняў? І чаму мы яшчэ толькі вучымся ганарыцца і карыстацца такімі культурнымі скарбамі?

Конкурс

## Давайце дзяліцца

**Неспрыяльная эпідэміялагічная сітуацыя сарвала нашы планы. Мы не паехалі адкрываць Беларусь, не пазнаёміліся з новымі маршрутамі і экскурсіямі. Пакуль яшчэ «на паўзе» работа многіх арганізацый, якія ладзяць вандроўкі. Але чаму б гэты час, які вас зачыніў дома з-за каранціну ці самаізаляцыі, не выкарыстаць для распрацоўкі планаў на будучае?**

Новы конкурс «Помнікі побач», які ладзяць арганізатары «Фэсту экскурсаводаў» сумесна з партнёрамі, дапаможа звярнуць увагу на цікавыя гістарычныя аб'екты. Варта толькі падзяліцца свежанькімі ці зробленымі летась фатаграфіямі і кароткімі (да пяці хвілін) відэасюжэтамі помнікаў гісторыі, культуры, дойлідства і прыроды. Гэта можа быць што заўгодна — камень ці балота, дот ці магілкі, капліца ці замак. Галоўнае, што вы асабіста наведалі гэтае месца. Фота і відэа могуць быць з вамі, вашымі блізкімі або проста сэлфі. Дадавайце кароткае апісанне помніка і ўласныя гісторыі, звязаныя з вандроўкай, можна нават выказаць свае ўражанні ці напісаць верш. Цудоўна, калі з адзнятымі мясцінамі звязана нейкая легенда ці традыцыя. Матэрыялы можна апублікаваць у сваіх сацыяльных сетках — «Фэйсбуку», «УКантакце», «Інстаграме» — з хэштэгам #помнікіпобач ці #pomnikipobach.

Нашчадкі традыцый

## АЎТЭНТЫКУ ДЗЕЦЯМ

**Традыцыйная народная культура запатрабавана цэнтрамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Хлопчыкі і дзяўчынкі ўдзельнічаюць у конкурсах казачнікаў, разам з педагогамі адраджаюць абрады, спевы і танцы, па сюжэтах легендаў і паданняў ствараюць вырабы і карціны. Нават рамесніцкія гурткіператвараюцца ў маленькія цэнтры па вывучэнні мовы, культуры і традыцый беларусаў, спрыяюць патрыятычнаму выхаванню дзяцей і моладзі.**

Так, толькі ў цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» горада Мінска існуе больш за 30 калектываў, якія ў сваёй выхаваўчай і адукацыйнай дзейнасці звяртаюцца да праблематыкі захавання народнага мастацтва і далучэння да яго сучаснай моладзі. Студыя дэкаратыўна-прыкладной творчасці сёння наогул больш нагадвае школу адраджэння нацыянальна-культурных традыцый. Да выхаваўчых праграм далучаюцца бацькі і бабулі навучэнцаў, ладзяцца вечарыны, імпрэзы, конкурсы.



Рэканструкцыя выхаванцамі цэнтра дадатковай адукацыі «Ветразь» абрада «Божая барада».

Аказалася, што сярод маладых сталічных сем'яў расце попыт на аўтэнтыку. У фальклорны калектыў «Мілавіца», дзе ўжо больш за 28 гадоў укараняецца аўтарская сацыяльна-педагагічная сістэма па вывучэнні, засваенні і актыўнай трансляцыі аўтэнтычных традыцый беларусаў, бацькі возяць дзяцей з усяго горада. «Канешне, гарадскія залы і сцэны — не найлепшае месца для знаёмства дзетак з абрадамі, — прызнаецца **кіраўнік калектыву Марыя СІНІТКО**. — Але мы стараемся рабіць рэканструкцыі, каб паказаць дзецям, наколькі цікавыя і прыгожыя былі, ёсць і, спадзяёмся, дзякуючы нашым навучэнцам і надалей будуць існаваць народныя традыцыі».

Сёння вопыт сталічных педагогаў па далучэнні дзяцей і моладзі да шматлікіх здабыткаў народнай культуры і іх арганічным увядзенні ў адукацыйны працэс пераймаюць іх калегі. На базе цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ветразь» горада Мінска створана Рэспубліканская апорная метадычная пляцоўка «Традыцыйная культура і моладзь».



Працяг тэмы

# АРТЭФАКТ ПАД ПЫТАННЕМ

**У маі «Звязда» расказвала пра тое, што ў вёсцы Студзёнкі пад Нясвіжам мясцовы краязнавец Аляксандр Абрамовіч знайшоў камень з надпісам, які быў выбіты, як мяркуюць, у памяць аб візіце ў гэтыя мясціны знакамітага паэта Адама Міцкевіча. (Падрабязней аб гэтай знаходцы можна прачытаць у нумары за 19 мая. — «Зв».). Каб удакладніць верагодную гістарычную каштоўнасць каменя, па кансультацыю мы звярнуліся да супрацоўнікаў дома-музея Адама Міцкевіча ў Навагрудку. І вось які адказ атрымалі.**



Той самы камень са Студзёнак.

«На камені, канешне, не паўторыш дакладна асаблівасці почырку Міцкевіча, — разважае **дырэктар музея, гісторык Мікалай ГАЙБА.** — Таму тут нельга сцвярджаць адназначна, ці капіраваў рэзчык убачаны на лісце аўтограф паэта, ці пісаў, як умеў сам — у гэтым кожны ахвотны можа пераканацца, калі паспрабуе параўнаць радкі на камені і подпіс Міцкевіча, ён ёсць у адкрытым доступе нават у «Вікіпедыі». Цікавейшая іншая рэч. Мы праштудзіравалі «Хроніку жыцця і творчасці Адама Міцкевіча. 1798 — 1824 гг.» — гэтае энцыклапедычнае выданне, якое ўбачыла свет у сярэдзіне мінулага стагоддзя ў Варшаве, утрымлівае найбольш поўныя звесткі пра ўсе акалічнасці, якія датычацца жыцця і творчасці паэта — перапіска, сяброўства, месцы, дзе ён бываў... Дык вось, у геаграфічным паказальніку гэтага грунтоўнага выдання такой вёскі, як Студзёнкі, наогул няма. Але ж камень — ёсць, як я зразумею, ён умураваны ў сцяну склепа, таму нельга сказаць, што гэта фэйк ці падробка. Цяпер задача мясцовых энтузіястаў і спецыялістаў у тым, каб высветліць усе абставіны, якім чынам гэты камень трапіў у мур, а тады ўжо разглядаць нейкія гіпотэзы».

Выходзіць, пытанне аб тым, ці гасцяваў Адам Міцкевіч у сядзібе пад Нясвіжам і ці натхняўся тамтэйшымі краявідамі, каб у будучым расказаць пра іх у паэтычных радках, застаецца адкрытым. Пошукі працягнуцца?

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**



Аўтограф паэта, змешчаны ў віртуальнай энцыклапедыі «Вікіпедыя».

Незвычайнае — побач

# КАМУ ШКОДЗІЦЬ ЧОРТАЎ КАМЕНЬ?



Беларускія класікі выдатна выкарыстоўвалі міфалагічныя вобразы ў сваіх творах — узгадаем Купалу, Багдановіча, Караткевіча. Некаторыя даследчыкі наогул жартуюць, што такі жанр літаратуры, як «фэнтэзі» быў прыдуманы ў Беларусі, бо яшчэ не было Толкіена, а ў нас Янам Баршчэўскім ужо былі напісаны чароўныя сюжэты. Міфічныя вобразы сустрэнем і ў творах Якуба Коласа, больш за тое, сёння можна нават і паглядзець на адно з апісаных ім цудаў — Чортаў камень. Гэты прыродны аб'ект класік згадаў у «Новай зямлі» і нават прысвяціў яму адну з «Казак жыцця».

Засталіся сведчанні таго, што ў сям'і Міцкевічаў (сапраўднае прозвішча пісьменніка), легенды, звязаныя з зачараваным месцам, дзеці чулі ад дзядзькі Антося. Напрыклад, ён распавядаў малым пра музыку, што заблукаў, у цемры выйшаў да каменя, а там яго чэрці прымусілі іграць на музычным інструменце.

Супрацоўнікі філіяла музея Якуба Коласа, што знаходзіцца на Стаўбцоўшчыне, збіраюць гісторыі, звязаныя з незвычайным месцам. І адзін з іх, Аляксандр Крыжэвіч, нават асобнае даследаванне прысвяціў гэтай тэме, усё ж камень запатрабаваны ў турыстаў, якія наведваюць коласаўскія мясціны. Ды і чаму б не зазірнуць у той чароўны, загадкавы свет, які натхняў класіка беларускай літаратуры?

Ляжыць авеяны легендамі і засведчаны ў літаратуры камень на радзіме паэта — паміж вёскамі Сверынава і Мікалаеўшчына. У «Новай зямлі» Колас пісаў, што «чортаў камень» памерам з хату, хоць сёння валун урос у зямлю, у вышыню ўсяго каля метра, а ў шырыню каля двух з паловай. І тым не менш бед ад яго хапае...

Пасля таго, як калгас праклаў новую дарогу, камень апынуўся на ўзбочыне. А раней шлях праходзіў якраз побач з зачараваным месцам і, як пісаў Колас: «Колькі людскіх калёс і восей пабіта і паламана аб камень! Колькі пакалечана рук і ног! А гузоў колькі набілі тут людскія галавы!» Але аказалася, што і ў наш час Чортаў камень не перастае шкодзіць. Гадоў з дзесяць таму сюды пачалі ездзіць маладыя, толькі вельмі хутка вясельная традыцыя сышла: у гэтым месцы перакульваліся і ламаліся машыны.

Невыпадкова месцічы завуць гэтыя мясціны Чартавіцай, расказваюць, што раней тут было балота, а менавіта ў такіх глухіх кутках па ўяўленнях нашых продкаў і сяліліся нячысцікі. І камень яны вынасілі, каб перакрыць людзям дарогу. Ёсць і іншыя паданні: быццам валун валок чорт, а пасля ці то стаміўся, ці нечага спужаўся ды кінуў.

Таксама месцічы казалі, быццам чорт заваблівaў людзей да каменя і пасля ці марозіў іх, ці здзекаваўся, насміхаўся. Калі якія небаракі тут доўга блукалі, лічылі, што іх чэрці водзяць па балоцістых мясцінах. Можа, таму даследчыкі з этнагістарычнага клуба «Явар», што вывучаюць сакральную геаграфію падчас канферэнцыі «Таямнічая Беларусь», пацвердзілі, што нават з прававедніком камень, апісаны Коласам, даваўся ім шукаць вельмі доўга?

Хочацца верыць, што пакуль старажытны камень абрастае гісторыямі, не перавядуцца людзі, якія захапляюцца родным краем, і будуць стваране пісьменнікамі новыя «Казкі жыцця».

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Пантэон Айчыны

# Эмілія Плятэр (1806—1831)



**Жыццё Эміліі Плятэр стала легендай, а яе імя — сімвалам самаахвярнай любові да Айчыны. Яе подзвіг услаўлены паэтамі і мастакамі. Яе параўноўвалі са славутай Жаннай д'Арк. За сваё кароткае жыццё яна зрабіла тое, на што іншы і за доўгія гады няздатны. Не толькі сваёй самаахвярнасцю і гераізмам увайшла ў гісторыю Эмілія Плятэр, але і як адна з першых беларускіх паэтаў і фалькларыстаў.**

Яе бацька, Францішак Ксаверый, паходзіў са старажытнага нямецкага роду Плятэраў, а маці Ганна Моль была родам з Браслава. Сямейнае жыццё бацькоў Эміліі не склалася. Маці з дачкой жылі ў маёнтку Ліксна Віцебскай губерні. Эмілія атрымала хатнюю адукацыю, захаплялася гісторыяй і матэматыкай. А ў вольны час ездзіла верхам на коні і вучылася страляць з пісталета. Пра такіх баявітых дзяўчынак кажуць: хлопец у спадніцы. Яна марыла пра геройны подзвіг за Айчыну. «Ад дзіцячых гадоў была думка, што калісьці пайду я на вайну», — прызнавалася пазней Эмілія.

Блізкасць да простага люду паўплывала на чуллівую душу дзяўчыны, Эмілія захапілася беларускім фальклорам і пісала па-беларуску «народныя» вершы. Хто ведае, каб інакш склаўся лёс Эміліі, ці не прысвяціла б яна сябе беларускай фалькларыстыцы і паэзіі.

Вобраз юнай Эміліі ўваскрашае ў сваіх мемуарах віцебскі настаўнік Максіміліян Маркс. У госці да яго маці ў Віцебск часта прыязджала Эмілія. Яна добра спявала беларускія народныя песні і танцавала пад заахвочвальныя воклічы гаспадароў і іх гасцей: «Ну паненка, ну дзявуха! Ды і яшчэ і якая дзявуха — залатая дзявуха!» З успамінаў Маркса Эмілія паўстае рамантычнай асобай. «Першая яна, — бадай, я не памыляюся, — з запалам, уласцівым чулым, высакародным сэрцам, аддалася душою беларускаму люду, вывучала яго бяду, спачувала ёй, стараючыся па магчымасці аблегчыць яе, збірала, спявала яго песні, шчодра плаціла за іх дастаўку і спрабавала пяро ў іх наследаванні. На фартэпіяна яна ўмела найвыразней перадаць і зухаватасць, і тугу народных матываў, нават тэмбр сапрана-жалейкі і баса-дуды... Галасам, у якім, здаецца, чуліся стагоддзі, яна пачынала:

Авой, авой, дзяцюк ты мой!
Не на радасць, не на шчасце ты радзіўся!

І ўсе выпрабаванні, усе пакуты жыцця беларускага мужыка падрабязна тут пералічваліся, дакладна апісваліся, глыбока нанова перажываліся».

Безумоўна, гэтыя два радкі не даюць поўнага ўяўлення пра паэтычны дар Эміліі. Але яе творчасць — з'ява знакавая! Як і Ян Чачот, і яго сябры філаматы, як і Ян Баршчэўскі, Эмілія была прадвеснікам беларускага Адраджэння.

Калі ў 1831 годзе пачалося паўстанне супраць царызму, Эмілія ўзяла ў рукі зброю. Яна стварыла невялікі атрад з чатырох дзяўчат. 29 сакавіка ў мястэчку Дусяты дзяўчына выступіла з прамовай перад людзьмі, заклікаючы іх падняцца на паўстанне. Яе радасна прывіталі: «Няхай жыве графіня Эмілія! Няхай жыве наша ясная паненка!» У атрад Плятэр уступіла некалькі сотняў добраахвотнікаў.

У першым баі 2 красавіка паўстанцы разбілі пяхотны аддзел царскіх войскаў. Акрыленая перамогай Эмілія вырашыла завалодаць Дынабургам. Высланы з горада царскі аддзел трапіў у засаду і быў разбіты. Праследуючы ўцекачоў, Эмілія хацела адразу ўзяць Дынабург. Каля горада дарогу паўстанцам загарадзіў батальён пяхоты з гарматамі. Агонь гармат пасеяў смерць у паўстанцкіх шэрагах. У такіх неспрыяльных умовах паўстанцы адступілі.

